Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

3 ЛІСТАПАДА 2020 г. АЎТОРАК № 214 (29328)

РЭЗЕРВЫ ПРАМЫСЛОВАГА РОСТУ

13

ПЧАЛА ЯК САКРАЛЬНАЯ ІСТОТА

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй КАСТЭНКА, дэкан эканамічнага факультэта Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Ф. Скарыны:

«Важна імкнуцца палепшыць тое, што ўжо ёсць. Найважнейшы пункт росту, акрамя інвестыцый, — павышэнне якасці і эфектыўнасці кіравання на дзяржпрадпрыемствах. І перш за ўсё гэтага можна дасягнуць за кошт прыходу на прадпрыемствы эфектыўных кіраўнікоў. Гэта могуць быць наёмныя работнікі, якія мелі б права на рызыку, былі б абароненыя. Да таго ж павінен быць прадугледжаны матэрыяльны стымул, які б падштурхоўваў да таго, каб прадпрыемства было інавацыйна ўспрымальнае».

На бураковыя «дажынкі»

Чарга аўтапаяздоў з цукровымі буракамі на Гарадзейскі цукровы камбінат.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Прэм'ера рубрыкі

РАДЗІМАЗНАЎСТВА. АДРАСЫ ПІСЬМЕНСТВА

«Звязда» пачынае сумесны праект з Мінскім аблвыканкамам

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Трылогія Года малой радзімы і сёлетняя пандэмія зрабілі так, што нарэшце (!) беларусы сталі цікавіцца Беларуссю. Адкрылі для сябе гэту «Зямлю Нязнаемую», выбраўшыся з сям'ёй ці з сябрамі на аўто ці на роварах у блізкія і не вельмі вандроўкі ў межах роднай краіны. Здзівіліся, уразіліся, захапіліся, знайшлі нагоду ганарыцца — прыгажосцю і разнастайнасцю прыроды, сціплай веліччу архітэктуры, смакам прыгатаваных па спрадвечных рэцэптах страў, гасціннасцю і прыязнасцю гаспадароў малых і вялікіх сядзіб... Здаволіліся, уздыхнулі з палёгкай, паставілі сабе «плюсік» у біяграфію: маўляў, і я ўжо тут не чужы, шмат дзе быў, шмат пра што ведаю, і па прадмеце «Радзімазнаўства» калі не «дзясятку», дык «сямёрку» ўжо зарабіў дакладна...

Але тая вялікая вандроўка, да якой з сённяшняга дня прапануе падключыцца вам «Звязда», наўрад ці была нанесена на вашай карце падарожжаў па Беларусі. А значыць — зноў будзе шмат новага, цікавага, дагэтуль невядомага (калі шчыра, самі ў прадчуванні). Мы вырашылі праехаць па літаратурных адрасах цэнтральнага рэгіёна нашай Радзімы — мясцінах, звязаных з імёнамі нашых славутых пісьменнікаў і асветнікаў, — не толькі з іх біяграфіяй, але і з творамі.

Мы завітаем у кожны з раёнаў Міншчыны і не сумняваемся, што ў кожным знойдзем нямала такіх адрасоў. Чарговы Дзень беларускага пісьменства будзе праводзіцца ў верасні наступнага года ў Капылі, там мяркуем у канцы лета і скончыць наша падарожжа. З чаго пачынаць — таксама вырашыць было нескладана. Менавіта Міншчына — калыска нашых самых славутых песняроў — Коласа і Купалы. А якраз сёння — дзень нараджэння Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча. Таму і першая публікацыя наша адтуль — з Коласавай радзімы, са Стаўбцоўскага раёна. Хоць, як дазналіся, і карані Купалы таксама тут, на прынёманскай зямлі. А колькі яшчэ вядомых літаратурных імёнаў з ёй звязана...

Значыць, у добры шлях!

СТАР. 4

КАРАТКА

- Мінлясгас прапаноўвае абмеркаваць выкарыстанне пастак пры паляванні.
- **На ўчастку трасы Мінск–Гродна зніжаны скорасны рэжым. Звязана такое рашэнне з пагаршэннем умоў надвор'я і набліжэннем зімы. Абмежаванне працягнецца да 1 сакавіка.**
- БДУ адкрыў новы сезон праекта «Студэнт на тыдзень».
- **Памёр старшыня Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Уладзімір Карагін.**

ISSN 1990 - 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Царква з'яўлялася і будзе з'яўляцца духоўнай асновай нашай дзяржавы»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім Веньямінам і старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай.

Па словах Прэзідэнта, абмеркаваць праблемы ў дзяржаве з Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім Веньямінам планавалі падчас нядаўняга адкрыцця храма ў Мінскім раёне. Ён падкрэсліў, што для краіны шмат значыць канфесійны мір, які ўдалося сфарміраваць за чвэрць стагоддзя.

«Я ганаруся, што гэта адбылося ў гады, калі мне прыйшлося служыць нашай Айчыне. Я вельмі гэта цаню, і гэта глыбока асабістае. Вы павінны разумець, што той міжканфесійны мір, які ў нас склаўся, мы нікому не аддадзім і заўсёды будзем прыхільнікамі міжканфесійнага міру», — сказаў Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што праваслаўная царква з-за сваёй велізарнай значнасці ў краіне заўсёды з'яўлялася апорай міру. У дзяржаве, па словах Аляксандра Лукашэнкі, пры вялікай колькасці іншых канфесій і абшчын (рымска-каталіцкая і грэка-каталіцкая царква, пратэстанцкія рэлігійныя арганізацыі, старавабрадцы, іўдзейскія арганізацыі, мусульманскія, будысцкія і іншыя) удалося захаваць раўнавагу і баланс.

«Пры ўсіх падзеях, што адбываліся і адбываюцца, асабліва ў Мінску, нам удаецца гэты міжканфесійны мір захаваць. Канешне, не без памылак з боку ўлад, не без памылак з боку нашых канфесій. Хачу, каб вы мяне разумелі, і іншыя таксама: калі хоць адна арганізацыя ў Беларусі, ці то грамадская, ці то рэлігійная, будзе мэтанакіраваная на разбурэнне дзяржавы, вы мяне зразумейце, я як кіраўнік дзяржавы па Канстытуцыі абавязаны абараняць гэту дзяржаву, буду вымушаны рэагаваць, — заявіў Прэзідэнт. — Прыклад таму — настаяцель каталіцкай царквы, які сёння я не ведаю, дзе знаходзіцца. Але ездзіць у Польшчу і атрымліваць кансультацыі, як разбураць нашу краіну, нікому не будзе дазволена».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў: валодае інфармацыяй, што мітрапаліта Веньяміна як кіраўніка Беларускай праваслаўнай царквы годна прыняла рэлігійная супольнасць: «Я яшчэ раз падкрэсліваю важную ролю праваслаўнай царквы і ваша прызначэнне, якое ўспрынята ў грамадстве вельмі станоўча».

Як ён адзначыў, улады супрацоўнічаюць не толькі з прадстаўнікамі праваслаўнай канфесіі.

«Пры маёй падтрымцы і мячэць пабудавана на пэўных умовах. І мусульмане ніколі нам не ствараліпраблем. Ніколі. Я часта кажу, што мусульмане заўсёды, на ўсіх выбарах падтрымлівалі ўладу і мяне як Прэзідэнта. Мы ніколі не дазволім заяўляць, як Прэзідэнт Францыі пачаў, пра свабоду слова і рэлігійныя пачуцці. Бачыце, у яго свабода слова. Ды не чапай ты прарока. Што дасць табе ў краіне крытыка мусульман?» — выказаў сваё меркаванне на апошнія падзеі ў Францыі Аляксандр Лукашэнка і прапанаваў выступіць пасрэднікам паміж Макронам і французскімі мусульманамі. Па яго словах, ён мае добрыя адносіны з мусульманамі на працягу двух дзесяцігоддзяў і катэгарычна не прымае ўмешвання ў справы вернікаў, асабліва тых, што спавядаюць ісламу.

«Мы ж ведаем, якія яны запальчывыя, рэактыўныя бываюць, калі іх абражаюць. Ці Макрон не ведае гэта? Ведае. Я гэты прыклад прыводжу таму, што мы ніколі сабе не дазволім кідаць камень у нейкага верніка. Мая пазіцыя заўсёды была: кожны чалавек павінен знайсці сваю дарогу да храма. Хочаш у касцёл — ідзі маліся. Хочаш у нашу царкву — ідзі маліся. Хочаш у мячэць — калі ласка, ідзі туды. Калі перавагу нашы людзі аддаюць праваслаўю, з гэтым трэба лічыцца», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, пандэмія каранавіруса значна паўплывала і на царкву. «Але мы ніколі не зачынялі храмы і зачыняць не будзем. Таму што любая бяда — ідзі і маліся, каб Гасподзь дапамог. Так мы заўсёды казалі», — дадаў Прэзідэнт.

Таму ён даручыў падтрымаць царкву і разгледзець магчымую дапамогу ва ўрадзе. Яшчэ адна праблема, на яго думку, — недахоп святароў.

«З-за мяжы, з чужых нам краін праваслаўная царква не вязе святароў, як гэта адбываецца ў некаторых канфесіях. Я Папу Рымскаму — і былому, і цяперашняму — абазначыў гэту тэму. Слухайце, як мы можам прымаць сёння святароў (хай не крыўдзяцца на мяне) з Польшчы, калі польская дзяржава, чыста каталіцкая, заняла такую пазіцыю ў адносінах да Беларусі. Гэта ненармальна», — падкрэсліў кіраўнік краіны і заявіў, што даўно ставіў перад Папам Рымскім пытанне пра неабходнасць рыхтаваць каталіцкіх святароў у Беларусі.

Яшчэ адна ідэя, якую чуў ад вернікаў Аляксандр Лукашэнка, — вярнуць праваслаўную адукацыю ў Жыровічы. «Жыровічы створаны па духу для падрыхтоўкі святароў. Трэба вывучыць разам з царквой гэту праблему і паглядзець. Таму што перанесці адукацыю зусім проста. Прыняў рашэнне — і перанёс. Але там павінна быць адпаведная база. Трэба паглядзець, што там зроблена і што яшчэ неабходна зрабіць, каб задаволіць патрэбнасці новага прытоку святароў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік краіны пракаментаваў чуткі пра візіт у Беларусь Папы Рымскага.

«Папа Рымскі — кіраўнік дзяржавы і царквы. Таму запрашэнне, калі пойдзе з Беларусі, павінна быць запрашэннем кіраўніка дзяржавы і праваслаўнай царквы. Ведаеце, я не хачу апынуцца між молатам і кавадлам, стварыць нейкія нязручнасці», — падзяліўся Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што цяперашні Папа гэта разумее. Ён назваў інсінуацыямі размовы, быццам Папа Рымскі прыедзе інкогніта. Падстаўляць яго, калі дзяржава запрашае, а «галоўная канфесія» і патрыярх не згодны — на гэта ўлады не пойдуць. «Мы раскольнікамі не былі і не будзем. Я не супраць, каб Папа Рымскі, не кажучы пра нашага патрыярха, і мусульманскія свята прыязджалі да нас. Ніхто не супраць, але на гэта павінна быць агульная згода, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Таму не трэба весці наконт гэтага незразумелыя размовы і ў палітычнай гульні разыгрываць гэтую карту. Гэта непрымальна».

Прэзідэнт выказаўся і наконт аддзялення царквы ад дзяржавы. «Як можа быць царква аддзелена ад дзяржавы? Чытай па-за дзяржавай быць. Не можа яна быць. Гэта апора, адзін са стрыжняў дзяржавы, калі хочаце адзін з ідэалагічных стрыжняў. Пакуль мы не выпрацавалі са сваёй ідэалогіі нейкую цэласную нацыянальную ідэю (сёння больш патрыятызм выступае на першае месца), царква з'яўлялася і будзе з'яўляцца духоўнай, ідэалагічнай, калі хочаце, асновай нашай дзяржавы», — сказаў кіраўнік краіны.

Ён падзяліўся, што «не можа існаваць у прасторы, дзе няма іншага пункту гледжання», але катэгарычна супраць парушэння законаў. «Пратэстоўцы кажуць, што яны мірныя, ходзяць, нічога не парушаюць. Ну як не парушаеце? Вы выходзіце на незаконныя, а сёння нават на нямірныя ўжо акцыі. Вы парушаеце грамадскі парадак, кідаецеся на міліцыю. Там букет парушэнняў, якія ж тут могуць быць патуранні, калі вы парушаеце закон? Калі хочаце падыскутаваць: студэнты ў ВНУ сабраліся, падыскутавалі. Але ж я ведаю, адкуль ногі растуць», — выказаўся Прэзідэнт наконт падзей, якія адбываюцца ў краіне.

Марыя ДАДАЛКА.

Праваслаўная царква ўносіць свае прапановы па змяненні Канстытуцыі

Як паведаміў Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веньямін, было прапанавана ўсім епархіям, сінадальным аддзелам выказаць свае заўвагі для новай Канстытуцыі.

«Зараз гэтыя прапановы апрацоўваюцца і ў найбліжэйшы час мы накіруем іх у адпаведныя заканадаўчыя структуры, каб там іх разгледзелі. У прыватнасці, яны датычацца пытанняў, звязаных з сям'ёй, захаваннем сямейных каштоўнасцяў, адукацыі, каб яна яднала ў сабе і выхаванне патрыятычных пачуццяў, маральнасці. Таксама мяркуем унесці прапановы, што датычацца сферы культуры», — сказаў мітрапаліт.

Таксама, па яго словах, святары павінны памятаць, што царква — месца сустрэчы вернікаў розных палітычных поглядаў і важна, каб словы святароў не аказвалі раздзяляючага ўздзеяння.

ЗБАЛАНСАВАНЫ РЭЖЫМ ДЛЯ ЭКАНОМІКІ І КОНТУРЫ ПЯЦІГОДКІ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклад прэм'ер-міністра Рамана Галоўчанкі

Асноўная тэма сустрэчы — бягучая сітуацыя ў эканоміцы. Яна працуе ў збалансаваным рэжыме: ВУП за дзевяць месяцаў склаў 98,7 %, нязначна расце прамысловая вытворчасць, вышэй прагнозу працуюць будаўнікі. Крыху здалі ў параўнанні з васьмю мінулымі месяцамі паказчыкі ў сельскай гаспадарцы (104,9 % у параўнанні з 107,9 %). У ходзе даклада таксама абмеркаванне праекта бюджэту краіны, змен у Падатковы кодэкс, праекта Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2021—2025 гады.

У пачатку сустрэчы Прэзідэнт падкрэсліў, што вельмі хацеў бы, каб насуперак нядобразычліўцам, эканоміка сёлета спрацавала не горш, чым у краінах вакол нас. Але галоўнае — тое, што вырабім, прадаць, заявіў Прэзідэнт.

Ён папрасіў коратка расказаць пра прагноз сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2021–2025 гады. Абмеркаванне гэтага дакумента яшчэ адбудзецца ў шырокім коле, а на Усебеларускім сходзе разгледзяць, па яго словах, «контуры пяцігодкі».

Цікавіла Аляксандра Лукашэнку і сітуацыя на прадпрыемствах.

«Тут жа нам ці то палякі, ці то французы спрабавалі расхістаць абстаноўку: «Забастоўка, забастоўка!» Ультыматумы заяўлялі. Я ў тэме. Малайцы працоўны клас наш і наша тэхнічная інтэлігенцыя, проста малайцы. Яны зразумелі, што могуць страціць, ды і людзі ўжо не тыя, што былі нават месяц таму. Зразумелі, што могуць страціць, і ўбачылі тых, хто да ўлады хацеў прыйсці. Гэта таксама карысна. Гэта ўрок з апошніх падзей», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Марыя ДАДАЛКА.

❍ Каментарый у тэму

Па словах Рамана ГАЛОЎЧАНКІ, стабільны ўнёсак у ВУП робяць сельская гаспадарка, будаўніцтва, інфармацыя і сувязь, фінансавы сектар, навука. Больш няпростая сітуацыя ў транспартнай галіне, спорце, ахове здароўя.

Увогуле вынікі работы эканомікі за дзевяць месяцаў Раман Галоўчанка назваў нядрэннымі, нягледзячы на складаныя ўмовы функцыянавання сусветнай эканомікі ў сітуацыі пандэміі.

«Эканоміка Беларусі, у цэлым, сябе адчувае, я сказаў бы, лепш, чым эканоміка еўрапейскага рэгіёна ў цэлым. У тым ліку дзякуючы тым вывераным і дакладным мерам па падтрымцы эканамічнага росту, што прымаюцца ў Рэспубліцы Беларусь, — сказаў журналістам кіраўнік урада. — Канешне, на фоне падзення эканомік нашых суседзяў, дзе на чатыры працэнты, дзе на пяць, а дзе і на дзевяць, трымаць тэмпы ў 100 працэнтаў складана, але магчыма пры пэўным збегу абставін».

Такімі абставінамі ён назваў — адсутнасць поўнага лакдаўна, жорсткіх каранцінных мер у нашых гандлёвых партнёраў.

Па яго словах, эканоміка Беларусі выбралася з прасядання ў другім квартале і ўстойліва рушыць да задачы па выхадзе на 100 % ВУП да ўзроўню 2019 года. Сярод рэзерваў, якія вынайшаў для росту ўрад, — разгрузка складоў.

«Мы маем вельмі нядрэннае сальда знешняй эканамічнай дзейнасці. Дадатнае сальда ў асноўным сфарміравана за кошт паслуг. Што атрымаецца па выніках года, не хачу загадваць, але ёсць рэзервы, каб выйсці на абазначаны рубеж», — дадаў прэм'ер.

Пацікавіліся магчымасцямі выйсці на ўзровень інфляцыі ў пяць працэнтаў. Раман Галоўчанка адказаў так: «Я не стаў бы выпячваць пяць ці шэсць працэнтаў. На самай справе, любая адназначная лічба ў гэтых умовах — гэта нядрэнны вынік. Ёсць фактары, на якія цяжка ўплываць. Мы ўважліва глядзім, што адбываецца на рынку, і тыя меры, якія магчыма прыняць, прымаем».

Пракаментаваў Раман Галоўчанка сітуацыю з забастоўкамі на прадпрыемствах. Па яго словах, напал адбываецца толькі ў пэўных інфармацыйных рэсурсах.

«Я толькі магу пацвердзіць, што ўсе прадпрыемствы, буйныя, сярэднія, працуюць у штатным рэжыме. Выконваюць свае задачы», — запэўніў ён.

На слыху

НЕ РАССЛАБЛЯЦЦА, НЯГЛЕДЗЯЧЫ НІ НА ШТО!

Чаму ў Чачэнскай Рэспубліцы такая нізкая захваральнасць на COVID-19

Сітуацыя з каранавірусам у Чачэнскай Рэспубліцы адна з самых спакойных, калі параўноўваць з іншымі рэгіёнамі Расіі. Афіцыйныя ўлады тлумачаць гэта старанным выкананнем прафілактычных мер, у прыватнасці, нашэннем масак. Мясцовыя жыхары дадаюць, што многія з іх перахварэлі падчас першай хвалі. Ну і, нарэшце, надвор'е на Паўночным Каўказе пакуль настолькі цёплае, што мы, жыхары паўночнага рэгіёна, можам лічыць яго амаль летнім.

Падчас прэс-тура для беларускіх і саюзных СМІ, арганізаванага Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы сумесна з МІА «Россия сегодня» і Нацыянальным прэс-цэнтрам Рэспублікі Беларусь, мы высветлілі, чаму Чачэнская Рэспубліка лічыцца адным з самых узорных рэгіёнаў у выкананні прафілактычных мер. Магчыма, не ўсе яны ўніверсальныя, але павучальныя — дакладна.

Грозны пачынаецца з аэрапорта. Натуральна, яшчэ ў самалёце «Масква—Грозны» некалькі разоў гучаць напаміны пра тое, што маску можна зняць толькі падчас ужывання ежы, увесь астатні час яна павінна быць надзета, прычым так, каб прыкрываць нос і рот. Сцюардэсы ўважліва за гэтым сочаць і, здаецца, цяпер па некалькі разоў правяраюць не толькі прышпіленыя рамяні бяспекі, але і наяўнасць маскі на тварах. Паколькі пасажыраў у самалёце няшмат, рассадка ў салоне адпаведная — сярэдні рад крэслаў не заняты, таму людзі знаходзяцца адзін ад аднаго на адлегласці. Аб'явы пра неабходнасць нашэння масак гучаць і ў аэрапорце — на яго тэрыторыі таксама нельга знаходзіцца без іх.

Наступны пункт — гасцініца, дзе зноў жа ўвесь персанал ад супрацоўнікаў на рэсэпшэне да афіцыянтаў у кафэ заўсёды ў масках. На прадпрыемствах, якія нам давялося наведаць, нагадваюць, што мы як наведвальнікі павінны не забываць пра сродкі абароны — маскі і аднаразовыя пальчаткі. У масках працуе і персанал. Адзін з фатографаў просіць зняць маску для фотаздымкаў дырэктара Грозненскай цеплаэлектрастанцыі, на што той адказвае, што гэта немагчыма. Бо згодна з распараджэннямі Расспажыўнагляду, на тэрыторыі прадпрыемства ён можа знаходзіцца без маскі ў адзіным месцы — сваім кабінеце, прычым толькі тады, калі там няма наведвальнікаў.

На ўваходзе на некаторыя аб'екты, у прыватнасці, на тую ж цеплаэлектрастанцыю, у журналістаў вымяраюць тэмпературу. Усюды прапануюць апрацаваць рукі антысептыкам. Апошні, дарэчы, беларускай вытворчасці знаходзім на цяплічным камбінаце «Поўдзень АграХолдынг».

— Мы, канешне, баімся каранавіруса, хоць многія з нас перанеслі яго падчас першай хвалі. Але хварэлі ў лёгкай форме, і невядома, ці з'явіўся імунітэт. Таму стараемся сябе абараніць — носім маскі, — дзеліцца супрацоўніца мясцовай тэлерадыёкампаніі ЧДТРК «Грозны».

Музеі, маршруткі, рэстараны — вы ўсюды павінны насіць маску. Калі раптам няма сваёй, вам яе ветліва прапануюць. Прыклад насельніцтву падаюць прадстаўнікі ўлады. Тыя ж супрацоўнікі паліцыі і дзяржаўтаінспекцыі, што патрулююць вуліцы Грознага, заўсёды ў масках, нягледзячы на тое, што знаходзяцца на адкрытым паветры. А дзяўчына-экскурсавод нават «дапрацавала» хустку, якая пакрывае галаву — цяпер у ёй маюцца невялікія адтуліны для гумак ад маскі.

Незвычайную карціну назіраем на цэнтральнай плошчы Грознага — плошчы Ахмата Кадырава. Да тых, хто тут адпачывае на арэлях, падыходзяць людзі ў медыцынскіх ахоўных касцюмах. Яны аказаліся не дэзынфектарамі, як мы спачатку памылкова вырашылі, а валанцёрамі чачэнскага рэгіянальнага аддзялення Усерасійскай грамадскай арганізацыі «Маладая гвардыя адзінай Расіі». Маладыя людзі прапануюць адпачываючым маскі і нагадваюць пра правілы прафілактыкі каранавіруснай інфекцыі. І трымаюць плакаты з немудрагелістымі заклікамі: «Насіце маскі. Беражыце здароўе». Валанцёры тлумачаць, што такія акцыі яны праводзяць у месцах, папулярных у гараджан, рэгулярна.

Мячэці таксама не сталі выключэннем для прафілактычных мер. Калектыўныя малітвы (а самыя масавыя тут прынятыя па пятніцах) адбываюцца з утрыманнем дыстанцыі. Прычым на дываны для веруючых нанесена спецыяльная разметка. Масачны рэжым тут асабліва важны — у мячэцях шмат людзей сталага веку.

Многія мерапрыемствы, спаборніцтвы, цяпер праводзяцца без гледачоў — у прыватнасці, XIII Адкрыты чэмпіянат Чачэнскай Рэспублікі па тактычнай стральбе, які прайшоў у кастрычніку на базе Расійскага ўніверсітэта спецназа ў Гудэрмесе. Дарэчы, летась беларусы выйгралі гэтыя спаборніцтвы. Сёлета з прычыны пандэміі нашы каманды не змаглі прыехаць. Здароўе ўсё ж даражэйшае.

Алена КРАВЕЦ,

г. Грозны.

Фота Паліны ЦІМАФЕЕВАЙ, Нацыянальны прэс-цэнтр Рэспублікі Беларусь.

Надвор'е

І ЛІСТАПАД БУДЗЕ ЦЁПЛЫ

Апошні восеньскі месяц абяцае быць на 1-2 градусы цяплейшы, чым звычайна

Ну што, кастрычнік быў проста «гарачы», ён аказаўся на 3-4 градусы цяплейшы за кліматычную норму. Дык вось, тэмпература паветра ў першай дэкадзе лістапада будзе таксама вышэй за норму, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Акрамя таго, паводле папярэдняга прагнозу, у першай дэкадзе месяца снегу пакуль не прадбачыцца. Нават мокрага.

У сераду надвор'е ў Беларусі абумовіць франтальны раздзел, які перамесціцца з Заходняй Еўропы. Будзе воблачна з прасяненнямі. Уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах чакаецца туман. Вецер прагназуецца пераменных напрамкаў, слабы з узмацненнем да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 3 градусаў да 10 цяпла, удзень — 6–12 градусаў вышэй за нуль.

Уначы і раніцай у чацвер наша краіна застанецца ў зоне атмасфернага фронту. На большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень атмасферны ціск вырасце, і ў многіх раёнах абыдзецца без ападкаў. Вось толькі ў паўднёва-ўсходніх раёнах краіны, дзе яшчэ будзе адбівацца ўплыў франтальнага раздзелу, пройдуць кароткачасовыя дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі чакаецца слабы туман. Вецер прагназуецца паўднёвы з пераходам на заходні ўмераны, удзень парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 2 да 8 градусаў вышэй за нуль, удзень — 5–11 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у канцы рабочага тыдня і ў гэтыя выхадныя мы будзем знаходзіцца ў вобласці павышанага ціску, таму істотных ападкаў не чакаецца. Месцамі будуць стаяць туманы. Вецер прагназуецца ў асноўным заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 1–7 цяпла, удзень — ад плюс 7 да плюс 12 градусаў. Такі тэмпературны фон значна (на 4–6 градусаў) перавышае кліматычную норму для гэтых лістападаўскіх дзён. Але трэба памятаць, што ўначы ўсё часцей будзе падмарожваць. І гэта норма, зіма не за гарамі...

Сяргей КУРКАЧ.

Сезон

АДКРЫЕЦЦА ПАЛЯВАННЕ НА ПУШНОГА ЗВЕРА

З 7 лістапада дазволена здабываць зайца-беляка, зайца-русака, вавёрку, куніцу лясную, куніцу каменную, норку амерыканскую, андатру і тхара ляснога.

Паляванне на зайца-русака і зайца-беляка дазваляецца ў светлы час сутак як ружэйным, так і безружэйным спосабамі. Ружэйнае паляванне на зайцоў дазволена з засады, з падыходу, загонам. Дапускаецца прымяненне гладкаствольнай паляўнічай зброі з выкарыстаннем патронаў са шротам, а таксама паляўнічых сабак усіх парод, пры безружэйным паляванні — хартоў і лоўчых птушак.

Ружэйнае паляванне на іншыя вышэйпералічаныя віды пушных жывёл дазволена ў светлы час сутак з падыходу, у тым ліку з паляўнічымі сабакамі ўсіх парод, акрамя ганчакоў і хартоў. Дазволенымі прыладамі пры ружэйным паляванні з'яўляюцца гладкаствольныя паляўнічыя стрэльбы з выкарыстаннем патронаў са шротам, наразная паляўнічая зброя калібру 5,6 міліметра. Пры безружэйным паляванні дазволена прымяняць капканы і пасткі (акрамя петляў).

У дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінага свету нагадалі, што пры паляванні на пушніну з гладкаствольнай зброяй паляўнічым забараняецца мець пры сабе патроны з кардэчу і кулямі. За іх нашэнне прадугледжаны штраф да 15 базавых велічынь, а пры паўторным парушэнні гэтай нормы — пазбаўленне права на паляванне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Падчас землятрусу ў Ізміры загінула больш як 80 чалавек

Колькасць ахвяр землятрусу ў турэцкім Ізміры ўзрасла да 85, паведаміла найбуйнейшае турэцкае інфармагенцтва «Анадолу». Паводле даных Упраўлення па прадухіленні і ліквідацыі наступстваў надзвычайных сітуацый пры ўрадзе Турцыі (AFAD), з 962 пацярпелых 743 выпісаны са шпіталяў, лячэнне 219 чалавек працягваецца. Пошукава-выратавальныя работы працягваюцца на завалах васьмі жылых дамоў. Колькасць грамадзян, вызваленых параненымі з-пад завалаў, дасягнула 105. Як вядома, магутны землятрус адбыўся 30 кастрычніка ў моры ў 19 кіламетрах на паўночны захад ад грэчаскага вострава Самас. Ён адчуваўся ў Афінах і Стамбуле. Падземныя штуршкі прывялі да абвальвання па меншай меры 20 дамоў у Ізміры, разбурэнні ёсць і ў грэчаскім горадзе Неон-Карлавасі.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне Прэзідэнту Турцыі Рэджэпу Таіпу Эрдагану ў сувязі з землятрусам у правінцыі Ізмір, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

У Германіі ўвялі жорсткі каранцін

Германія абвясціла пра лакдаўн на фоне росту выпадкаў заражэння каранавірусам. Тэкст адпаведнай заявы канцлера Ангелы Меркель быў апублікаваны на сайце ўрада краіны. Так, з 2 лістапада ў Германіі зачыняюцца, у прыватнасці, рэстараны, бары, кінатэатры, забаўляльныя ўстановы, фітнес-клубы, басейны, а таксама абмяжоўваецца работа крам. Гатэлі падчас каранціну не змогуць прымаць турыстаў, за выключэннем грамадзян у дзелавой паездцы. Жыхарам краіны забаронена збірацца ў кампаніях больш за дзесяць чалавек у грамадскіх месцах. Каранцін у краіне працягнецца як мінімум да канца восені. Па словах Меркель, гэтыя меры неабходныя, каб пазбегнуць калапсу германскай сістэмы аховы здароўя.

Горад інкаў Мачу-Пікчу аднавіў прыём турыстаў

Улады Перу дазволілі аднавіць турыстычныя паездкі ў старажытны горад інкаў Мачу-Пікчу пасля перапынку, які працягваўся амаль восем месяцаў, паведаміла BBC News. Там прайшла ўрачыстая цырымонія, удзельнікі якой падзякавалі багам у адпаведнасці з абрадамі племені. Цяпер Мачу-Пікчу будзе прымаць па 675 турыстаў у дзень, гэта прыкладна 30 працэнтаў ад звычайнага патоку. Работа з групамі будзе праводзіцца з захаваннем усіх санітарна-эпідэміялагічных патрабаванняў, уведзеных з-за каранавіруса. Закрыццё комплексу, які забяспечвае работай дзясяткі тысяч жыхароў горнага раёна Куска, было цяжкім ударам па турыстычнай індустрыі Перу. Археолагі лічаць, што Мачу-Пікчу («старая гара», у перакладзе з кечуа) быў пабудаваны ў XV стагоддзі на вяршыні горнага хрыбта на вышыні 2400 метраў над узроўнем мора імператарам Пачакуцекам у якасці ўласнай рэзідэнцыі-святыні. Цяпер горад з'яўляецца аб'ектам Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. У комплексе засталіся руіны каля 200 каменных збудаванняў — храмаў, рэзідэнцый і гаспадарчых пабудоў.



Радзімазнаўства. Адрасы пісьменства

«ДЗЕ ЛЬЕЦЦА

Якую кнігу Коласа браў у космас Пётр Клімук, куды на равэрку ехаў Янка Маўр

Аднойчы нехта не паленаваўся і падлічыў: на Стаўбцоўшчыне нарадзілася больш пісьменнікаў, чым у якім-кольвек іншым рэгіёне Беларусі. Статыстыкі, якая гэта бясспрэчна б даводзіла, знайсці, на жаль, не ўдалося, але мясцовыя перакананыя, што факт дакладны. Праехаўшы па наваколлі, даведаўшыся падрабязнасці, пачынаеш разумець, што, напэўна, так яно і ёсць. Вось, напрыклад, якая яшчэ вясковая школа ў краіне можа пахваліцца, што да літаратуры прычыніліся больш за трыццаць яе выпускнікоў? А недалёка ад Стоўбцаў такая школа ёсць. І будавалі яе па замове Якуба Коласа, і носіць яна яго імя, прычым здаўна, калі пісьменнік яшчэ быў жывы... Карацей, здаецца, калі Пімен Панчанка пісаў: «Ёсць яшчэ адзін куточак запаветны, // Дзе растуць, нібы грыбы, здаўна паэты», ён, канешне, меў на ўвазе ўсю Беларусь, а ўяўляў канкрэтна вось гэты прынёманскі край.

На сядзібе ў Акінчыцах цяпер таксама гаспадараць Міцкевічы — жонка дзядзькі Юркі Соф'я Пятроўна і праўнучка Коласа Васіліна.

«НОВАЯ ЗЯМЛЯ» ЯК ТУРЫСТЫЧНЫ БУКЛЕТ

Канешне, першымі пунктамі прызначэння ў літаратурнай вандроўцы па Стаўбцоўскай зямлі будуць Коласаўскія мясціны. Тут паэт нарадзіўся, вырас, пераязджаў з бацькамі па наваколлі з адной леснічоўкі ў другую. Усё наваколле апісана ў «Новай зямлі», тут вам раскажуць, што Парэчча ў паэме — гэта Альбуць, і дэкламуючы: «Цякла тут з лесу невялічка травой заросшая крынічка», пакажуць амаль перасохлую ручаінку перад уваходам на леснікову сядзібу з каментарыем: «Тая самая крынічка!»

У Акінчыцах, там, дзе нарадзіўся паэт, яшчэ некалькі гадоў назад можна было застаць дзядзьку Юрку, Юрыя Міхайлавіча Міцкевіча, які стаў бадай што такой жа славутасцю гэтых мясцін, як і яго блізкі сваяк (Колас даводзіўся стрэйшым братам яго дзеду Юзіку). Ніхто так, як ён, не чытаў на памяць «Новую зямлю», ніхто так, з такім іскрыстым гумарам не цытаваў верш пра «доктара Бобрыка». Дзе б дзядзька Юрка ні пачынаў распавядаць пра Коласа — каля яго заўсёды збіраліся зацікаўленыя слухачы. А ён з цёплымі іскрынкамі ў вачах, не ленаваўся зноў (каторы ўжо раз!) расказваць і пра сваю першую сустрэчу са сталічным родзічам (чатырохгадовы, прачытаў Коласу верш пра пярэсценькага катка, за што атрымаў ад паэта дзвесце рублёў — цэлае багацце для пасляваеннага часу). І пра тое, як Колас прыязджаў на радзіму апошні раз за некалькі месяцаў да смерці. Паэту тады вельмі балелі рукі, і хтось параіў, што вылечыць іх можна, прыкладаючы граззю з родных мясцін. Ён прыехаў на машыне, на разлезлай дарозе аўто забуксавала, і цягнуць славутага земляка сабралася ўсё наваколле, і атрымалася так, што ў свой апошні прыезд пабачыў Колас на радзіме амаль усіх блізкіх і знаёмых людзей... З хваляваннем паказваў дзядзька Юрка малады дубок каля сядзібы ў Акінчыцах — яго выгадавалі з жолуда дуба Тараса Шаўчэнкі, але ж нехта пастаянна ламаў дрэўца, якое з усіх сваіх кволых сіл трымалася за жыццё...

Няма ўжо на зямлі Юрыя Міхайлавіча, але ў музейнай сядзібе і сёння гаспадараць сваякі Паэта, таксама Міцкевічы — мы якраз заспелі на ёй і жонку дзядзькі Юркі Соф'ю Пятроўну, і праўнучку Якуба Коласа і Янкі Маўра Васіліну. Перакананыўшыся, што самы каштоўны (бо аўтэнтычны) экспанат акінчыцкай хаты — разец дзядзькі Антося — таго самага працавітага дзядзькі з «Новай зямлі», на

Той самы дуб, пад якім Кастусь Міцкевіч склаў свой першы верш.

Пётр Клімук уласнаручна засведчыў, што браў томік Коласа ў космас і падарыў яго музею ў Смольні.

Кажуць, гэта той самы стол, за якім Колас і Купала адзначалі першую сустрэчу.

зямлю. // З зямлёю жыць у згодзе люба...» (гэта ўжо, калі хто забыўся, з іншай паэмы, з «Рыбаковай хаты»).

***

Альбуць, яшчэ адно жытло сям'і лесніка, зусім недалёка ад Акінчыц — як па лесе, дык кіламетры два, мясцовыя музейшчыкі мараць адкрыць тут сцяжынку, па якой можна будзе прыемным шпацырам або на ровары трапіць з адной сядзібы ў другую. Тут, акрамя ўжо згаданай крынічкі, абавязкова пакажуць «той самы дуб» — дрэва, пад якім малы Кастусь Міцкевіч склаў свой першы верш «Вясна», за што атрымаў ад бацькі цэлы рубель. На ўсе сумненні, ці той самы гэты дуб, вам упэўнена адкажуць: «Канешне!» І ў гэта верыш, бо дубы ў Альбуці ўвогуле знатныя — таўшчэзныя, паспрабуеш зазірнуць на верхавіну, стоячы каля камля — галава кругам ідзе. У «той самы» трапіла маланка, падпаліла ствол ля зямлі, але ж ён трымаецца (падобна з Акінчыцамі гісторыя выглядае ўжо не супадзеннем, а і праўда жыццесцвярджальным сімвалам). У музеі спадзяюцца, што мясцовыя дрэвы возьмуць пад сваю апеку і догляд эколагі — яны ж як-ніяк жывыя сведкі як мінімум эпохі...

Па Альбуці можна сапраўды хадзіць з «Новай зямлёй» у руках і пазнаваць дэталі ў вершаваных радках, толькі што ў Коласа сядзіба называецца Парэчча. Але можна даведацца і пра тое, аб чым у паэме не напісана. Напрыклад, пра пажар у Альбуці-Парэччы радкі ёсць, а вось чаму загарэлася тая леснікова хата — Колас не піша. А прычына ў папярэдніку Міхала на пасадзе лесніка. З'язджаючы, ён пакінуў занядбаную сядзібу і не пачышчаны комін — у ім пасля і загарэлася сажа. Так з-за нечай нядбайнасці і давялося жыць у зямлянцы, страціўшы ўвесь набытак — «згарэлі кросны, рад багоў // і грошай сорак сем рублёў...»

***

Смольня — яшчэ адзін прыпынак на Коласавай радзіме. Гэта сядзіба звязаная і з іменем Янкі Купалы — менавіта тут у 1912 годзе адбылася першая сустрэча двух класікаў. Купала павінен быў прыехаць на рамізніку са Стоўбцаў, але чамусьці скіраваўся пешшу па беразе Нёмана (паводле адной з версій, патрацыўся на пачастунак, не хапіла грошай). Дарога, мяркуючы па ўсім, Івана Дамінікавіча не ўразіла: была блытаная і «большай часцю праходзіла лесам з рознымі адгалінаннямі дарог і дарожак управа і ўлева», як успамінаў ён пасля. Да таго ж новыя чаравікі намулялі ногі...

Аб чым класікі гаварылі пры першым знаёмстве (і колькі выпілі), гісторыя замоўчвае. Затое захаваўся стол, за якім яны сядзелі. Кажуць, студэнты, якія тут часта бываюць, аднойчы нават цэлую работу пісалі — меркавалі, што на стале стаяла і пра што за бяседай гаварылася. А мінскія турысты, здараецца, пытаюць, ці той гэта ганак, на якім Купала нібыта паваліўся, — ім гэту байку распавядаюць сталічныя экскурсаводы. Чуткі і плёткі — сцвярджаюць мясцовыя. Ніякіх доказаў таму няма.

Сярод турыстаў здараюцца і скептыкі, якія не вераць, што ў літаратурнай частцы музея захоўваецца кішэннае выданне «Новай зямлі», якое пабывала ў космасе разам з Пятром Клімуком. Маўляў, у той час вага касманаўта была пралічана да міліграма і ніхто не дазволіў бы ўзяць з сабой кніжку. Але ж вось вісіць пад шклом яго, касманаўта нашага, уласнай рукой у кастрычніку 1975-га напісанае: «У космас узяў кніжачку яго паэзіі. Там, у прасторах сусвету, асаблівым сэнсам напаўняліся яго бессмяротныя словы: «Мой родны кут, як ты мне мілы, забыць цябе не маю сілы»... І тая самая кніжачка на стэндзе, маленькая, з далонь...

Яшчэ адна цікавая гісторыя, пачутая ў Смольні, — пра другі нелегальны настаўніцкі з'езд, які праходзіў у 1906 годзе ў Прыстаньцы, непадалёк ад Мікалаеўшчыны (пасля якога Коласа спачатку звольнілі з пасады, а пасля пасадзілі ў астрог, дзе ён і пачаў пісаць «Новую зямлю»). Дык вось, кажуць, што з'езд, сам таго не хочучы, выдаў паліцыі Янка Маўр (тады яшчэ Іван Фёдараў). Ён рашыў пафарсіць і прыехаў на з'езд на равэрку — па тым часе гэты транспарт для вясковага наваколля быў, як сёння «тэсла», — чым прыцягнуў увагу ўсіх, у тым ліку і паліцыянта...

На другім паверсе літмузея ў Смольні месціцца жывапісная, з натуры, выява хаты ў Цёмных Лядах — там Колас настаўнічаў, калі ўжо быў пазбаўлены гэтага права, за што яго брат Уладзя, што служыў там лесніком, меў вельмі вялікія непрыемнасці. Сядзібы сёння няма: чыгуначнай службе ў 60-я гады патрэбна была там зямля. Засталася толькі назва дачнага прыпынку, на якім спыняюцца далёка не ўсе электрычкі. А так — быў бы яшчэ адзін прывабны пункт для зацікаўленых турыстаў.

НЁМАН СРЭБРАВОДНЫ...»

і пешшу ішоў Янка Купала, і як Павел Шпілеўскі паблытаў Стары і Новы Свержань

Школа ў Мікалаеўшчыне больш падобная на палац. Яна, пабудаваная па замове Коласа, носіць імя пісьменніка з 1947 года.

ТАЛЕНТЫ І ПРЫХІЛЬНІКІ

Калі ўжо пісаць пра мясціны Стаўбцоўшчыны, звязаныя з літаратурай і літаратарамі, нельга не згадаць установы адукацыі, прынамсі дзве школы. Тая, што ў вёсцы Мікалаеўшчына — а вёска, як ведаем з урокаў, мае да Якуба Коласа самае непасрэднае дачыненне, — уражвае ўжо з першага погляду сваёй архітэктурай. Не школа — палац, пабудаваны ў стылі сталінскага ампіру: двухпавярховы, з калонамі. У 1946 годзе яе пабудавалі ў Мікалаеўшчыне клопатамі самога Коласа. Гэта была першая двухпавярховая вясковая школа ў краіне. Калісьці ў яе хадзіла амаль чатырыста вучняў, цяпер — пяцьдзясят. Але «каласкі» нават у такім невялікім складзе з гонарам нясуць імя славутага земляка. У школе дзейнічае цікавы музей, у якім, вядома ж, і экспазіцыя, прысвечаная пісьменніку, і кнігі з аўтографамі нашых літаратараў. У 1966 годзе, да стагоддзя школы як установы адукацыі, тут ладзілася вялікая імпрэза. Свае кнігі з дарчымі надпісамі тут пакінулі Янка Брыль, Пімен Панчанка, іншыя славутыя пісьменнікі, што наведалі тады Коласаву школу. Не меншую ўвагу прыцягвае яшчэ адзін стэнд з кнігамі. Гэта — творы выпускнікоў Мікалаеўшчынскай школы. Яўген Хвалей, Мікола Маляўка, Алесь Камароўскі, Ніяна Загарэўская... Імёны ў сучаснай беларускай літаратуры вядомыя. А ўвогуле трыццаць тры выпускнікі з гонарам расказваюць у школе, маюць дачыненне да прыгожага пісьменства. Гэткая канцэнтрацыя талентаў у адным месцы, магчыма, стане калісьці прадметам асаблівага вывучэння.

У літаратурным музеі Дзераўнянскай школы ёсць нават адмысловая тэматычная карта раёна.

А ў Дзераўнянскай школе, што амаль на мяжы з Валожынскім раёнам, дзейнічае адмысловы музей «Стаўбцоўшчына літаратурная». Экспазіцыя зроблена дэталёва і цікава — тут вам і карта раёна з пазначанымі паселішчамі, што звязаныя з літаратурай, і гісторыі ўраджэнцаў гэтых мясцін, якія маюць да пісьменнікаў і пісьменніцтва дачыненне. Вось тут мы і высветлілі, што на Стаўбцоўшчыне карані не толькі Якуба Коласа, але і Янкі Купалы. Аказваецца, маці паэта Бянігна Іванаўна нарадзілася тут, у фальварку Няшота пад Рубяжэвічамі, а бацька Дамінік Ануфрыевіч арандаваў зямлю каля Цеснавой.

Сярод выпускнікоў школы — вядомыя пісьменнікі Казімір Камейша і Генрых Далідовіч. Яўген Карпуць, які жыве ў Стоўбцах, даволі часты госць у Дзераўной. Іх творы вучні актыўна выкарыстоўваюць пры правядзенні экскурсій па музеі — напрыклад, ставяць тэатральную пастаноўку паводле апавядання Далідовіча «Зіна». Музей, як і ўся школа, жыве актыўным жыццём — нават экскурсіі тут праводзяць не толькі на беларускай мове, але і на англійскай. У школе займаецца цяпер каля двухсот вучняў, і ўсе яны разам з настаўнікамі далучаныя да творчай, пошукавай, даследчыцкай працы. «Стварэнне інтэрактыўнай карты мікратапонімаў», «Лексічны слоўнік вёскі Дзераўная», «Сістэма пераносных значэнняў у творах Яўгена Карпуця»... Гэта работы не студэнтаў філфака, а вучняў звычайнай вясковай школы. Ёсць чаму здзівіцца, праўда?

ХРАМЫ ДЛЯ ШПІЛЕЎСКАГА І СЫРАКОМЛІ

Храмы ў Новым Свержані, падобныя паміж сабой, бы родныя браты, не нашмат змяніліся з часоў падарожжа Шпілеўскага.

Дарэчы, пра турыстаў. Неабыякавыя падарожнікі ездзілі па гэтай зямлі яшчэ задоўга да Коласавага нараджэння і ўжо тады знаходзілі тут нямала цікавага. Вось, напрыклад, Павел Шпілеўскі, наш славуты этнограф і публіцыст, які ў 1851 годзе праехаўся ад Варшавы да Ігумена (сённяшняга Чэрвеня) і напісаў нарыс «Падарожжа па Палессі і беларускім краі», які лічыцца адным з першых дакументальных этнаграфічных даследаванняў. Дык вось, у ваколіцах Стоўбцаў з шаноўным падарожнікам выйшла неспадзяванка — такі ўважлівы заўсёды ў дэталях, тут ён пераблытаў усё, што можна было пераблытаць. Быў у Новым Свержані, а напісаў, што ў Старым, паставіў два Свержані на розных берагах Нёмана, хоць насамрэч абедзве вёскі стаяць на адным баку ракі. Дакладней, Новы — на самім Нёмане, а побач са Старым працякае невялікая Залужанка...

Але галоўнае ў нашай вандроўцы тое, што ў Новым Свержані і сёння можна пабачыць храмы, якія сто семдзесят гадоў таму найбольш уразілі Паўла Шпілеўскага. (Ураза самага італьянца Бернардоні, які прычыніўся да нясвіжскіх уладанняў Радзівілаў. Успенская царква і Петрапаўлаўскі касцёл стаяць зусім побач адно ад аднаго, як браты-пагодкі. Яно так і ёсць — царква маладзейшая за касцёл толькі на два гады, з 1590-га. З 1511-м Шпілеўскі даў маху. Хоць, магчыма, на гэтым месцы стаяла іншая царква.

Яшчэ адзін руплівец прыгожага пісьменства XIX стагоддзя Людвік Кандратовіч (ён жа Уладзіслаў Сыракомля), працуючы ў канцылярыі Радзівілаў, таксама шмат ездзіў па гэтых мясцінах і пісаў пра іх. «Сярод ураджайных раўнінных палёў ляжыць мястэчка Гавязна з прыгожай мураванай царквой», — чытаем у ягоным даследаванні «Нёман ад вытокаў да вусця». Гавязны ў наваколлі Стоўбцаў ужо няма — у 1964 годзе яна стала Вішняўцом. Перайменавалі як немілагучную, хоць мясцовыя бабулі сцвярджаюць, што тая, старая назва была ад слова «гавець» — вельмі набожныя тут заўсёды былі людзі. У Сыракомлі пра гэта не сказана нічога, але, калі даведваешся, што царква 1742 года пабудовы, якая сёння выглядае проста як цацка, была адрамантавана за кошт прыхаджан, якія збіралі грошы некалькі гадоў, пачынаеш у тое верыць. Прадцечанская царква — шыкоўнае беларускае барока — і сёння радуе вока і душу. Унутры захавалася з XVIII стагоддзя пакручастая вузенькая вітая лесвіца на хоры, на якіх апынаешся вочы ў вочы з намаляваным над алтаром Хрыстом. Выява Збаўцы новая, але Сыракомлю, які шмат увагі звяртаў на аздобу храмаў, яна б, напэўна, спадабалася.

Царква ў Гавязне ўражвала не толькі Уладзіслава Сыракомлю. «Мястэчка пад крыжам» — так звалі Гавязну ў наваколлі.

ПІСЬМЕННІК ФЕЛІКС ЭДМУНДАВІЧ

Зусім недалёка ад Дзераўной, калі ехаць на Івянец, ёсць яшчэ адно цікавае месца, куды варта завітаць. Дзяржынава — радзіма Фелікса Эдмундавіча. Так-так, таго самага, Дзяржынскага. На адноўленай родавай сядзібе зараз месціцца надзвычай цікавы музей. Тут можна ўбачыць, як жыла сям'я «жалезнага Фелікса» — заможная шляхецкая сям'я; даведацца, што ягоны брат Станіслаў быў забіты ў 1917 годзе, а яшчэ адзін брат, Казімір, — апошні гаспадар сядзібы — разам з жонкай быў расстраляны фашыстамі за сувязь з партызанамі. У тым жа 43-м падчас карнай аперацыі фашыстаў згарэў і драўляны дом з мезанінам...

Сярод экспанатаў музея — зусім невядомая скульптура работы Заіра Азгура — Дзяржынскі з беспрытульным дзіцем на руках. Дзіўна, праўда? Мы проста мала ведаем. Дзяржынскі — менавіта той чалавек, які ўзяў на сябе клопат па ўладкаванні дзяцей, што, кажучы сучаснай мовай, засталіся без апекі бацькоў у калатнечы Першай сусветнай, Грамадзянскай войнаў, рэвалюцыі. Яшчэ — а гэта ўжо дакладна

Фелікс Дзяржынскі, аказваецца, напісаў нямала кніг.

да тэмы нашай рубрыкі — у музеі ёсць стэнд з кнігамі, якія напісаў Фелікс Эдмундавіч. «Дзённік зняволенага. Пісьмы». На рускай, англійскай, французскай, іспанскай мовах. «Як нам змагацца», «Аб гаспадарчым будаўніцтве», «Прамысловасць СССР, яе дасягненні і задачы»... Нездарма кажуць, што і гэты ўраджэнец Стаўбцоўскага краю быў назвычай адукаваны і рознабаковы чалавек.

***

Ёсць мясціны, якім уласцівы дзівосны магнетызм. Стаўбцоўшчына, несумненна, — адна з такіх. Сюды варта прыехаць яшчэ і яшчэ — паслухаць незвычайна мяккую правільную мову, пастаяць каля чатырохсотгадовых простых храмаў, пагладзіць рукой кару старога дуба, пад якім Паэт напісаў першы верш, успомніць, адчуць і зразумець, як гэта можа быць увосень: «І ты маўчыш, маўчаць і далі. // Нібы ў адной агульнай хвалі,// Ў адной асветленай часіне // Жыццё злучыла свае плыні...»

Алена ЛЯЎКОВІЧ.
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Извещение о проведении 23 ноября 2020 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

Предмет торгов
Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-130521 общей площадью 1862,8 кв. м (наименование: здание производственной базы; назначение: здание многофункциональное; составные части и принадлежности: трехэтажное из ж/б панелей и кирпича здание производственной базы); капитальное строение с инвентарным номером 600/С-165694 общей площадью 717,1 кв. м (наименование: склад-навес; назначение: сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: склад-навес А, площадка а1, ограждение а2, сеть электроснабжения Б, сеть водоснабжения В)
Сведения о земельном участке: площадь – 1,2993 га, кадастровый номер – 623650100001002871
Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Загородная, 1В, 1В/1
Начальная цена: 1 885 851,00 бел. руб. без учета НДС
Сумма задатка: 188 000,00 бел. руб.

Продавец имущества: ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.
Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.
Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

— В Марий Эл жила и работала детская писательница Нина Жибрик — уроженка Беларуси. Нельзя ли каким-то образом отметить, увековечить ее память в Марий Эл?

— Нина Иосифовна Жибрик — известная поэтесса в Марий Эл, которая писала как для взрослых, так и для детей. В нашей республике любят этого автора и относятся с большим уважением к ее творчеству. К сожалению, уже восемь лет как Нины Иосифовны нет с нами, но ее литературное наследие живет и не забывается.

В Звениговском районе Республики Марий Эл, где она прожила почти 25 лет, в память о поэтессе ежегодно проводятся Жибриковские чтения. В фонде Звениговского краеведческого музея хранятся ее лесные скульптурные работы, изготовлением которых она увлекалась.

Открытие памятной доски планируется в 2023 году, в год 90-летия Нины Жибрик.

— Мы, белорусы, очень признательны Марийскому книжному издательству за широкое внимание к белорусской литературе. Есть у нас и просьба. Возможно, на перспективу. Большой популярностью у нас в стране пользуются произведения классика белорусской литературы Владимира Короткевича. Только за последнее десятилетие в Минске на белорусском и русском языках издано 50 его книг общим тиражом около 100 тысяч экземпляров. Нельзя ли издать в переводе на марийский язык книгу избранных произведений нашего классика? На наш взгляд, это станет событием и для марийского читателя, и для марийской школы художественного перевода.

Поздравляя вас с грядущим юбилеем Марий Эл, хотели бы выразить признательность за ту многогранную работу, которую осуществляет для развития белорусско-марийских гуманитарных, культурных, литературных отношений писатели, книгоиздатели Марий Эл!

— Мы обязательно рассмотрим этот вопрос. Думаю, что произведения Владимира Короткевича, так полюбившиеся вашим читателям, найдут отклик и среди наших любителей литературного слова.

Благодарю вас за поздравление и приглашаю жителей Беларуси в Марий Эл. Уверен, наша республика произведет на вас приятное впечатление и оставит только добрые воспоминания о нашем гостеприимстве.

Беседовал
Кирилл ЛАДУТЬКО.

ЯК ЗАРАДЖАЎСЯ ПАРТЫЗАНСКІ РУХ?

Дакументы сведчаць

У межах сумеснага праекта Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнай бібліятэкі падрыхтавана электроннае дакументальнае выданне «Зводкі і спецпаведамленні кіруючых органаў партызанскага руху ў Беларусі: 1942 год». У яго ўвайшлі лічбавыя копіі дакументаў, якія сведчаць пра зараджэнне партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі. Большасць дакументаў друкуецца ўпершыню.

Пытанняў становіцца больш

Электроннае выданне працягвае серыю «Партызанскі архіў». Раней ужо друкаваліся дакументы 1944 года. Асаблівая каштоўнасць новага зборніка ў тым, што змешчаныя ў ім дакументы адлюстроўваюць найбольш складаны перыяд — у 1942 годзе сувязі са штабамі былі наладжаны слаба, радыёстанцый у партызанаў было мала, дакументацыя, што вялася народнымі мсціўцамі, асядала ў атрадах і падчас карных аперацый немцаў знікала ці спецыяльна знішчалася.

Наогул матэрыялаў, якія датычацца зараджэння партызанскага руху, уведзена ў навуковае абарачэнне не так многа, як за 1943—1944 гады. Але дзякуючы рабоце архівістаў велізарны масіў раней не публікаваных дакументаў — аператыўных, інфармацыйных, разведвальных зводак, спецпаведамленняў і іншых — становіцца даступны шырокаму колу грамадства. Да таго ж аблічбоўванне дазваляе лепш захоўваць першакрыніцу, абмяжоўваючы да яе доступ.

— Мы назіраем устойлівую тэндэнцыю росту інтарэсу да гэтай тэмы, значна павялічылася колькасць наведванняў чытальнай залы, заказаў спраў, звязаных з партызанскім рухам, — заўважыў **загадчык адзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук Святаслаў КУЛІНОК.** Спрыяе росту такой цікавасці і тое, што ў краіне адзначаны «Гады малой радзімы», у архіў ідуць даследчыкі, якіх цікавіць партызанскі рух у той мясцовасці, дзе яны нарадзіліся. Зборнікі дакументаў, што рыхтуюцца архівістамі, змяшчаюць багата інфармацыі па гісторыі раёнаў, вёсак. Аблічбоўванне і папулярызацыя дакументальнай спадчыны спрыяюць распаўсюджванню ведаў, бо дакументы — бясспрэчны доказ таго, наколькі масавы і эфектыўны быў партызанскі рух.

Наогул, публікацыйнай дзейнасцю архівы актыўна пачалі займацца з 90-х гадоў. З тых часоў выдадзена звыш сотні зборнікаў дакументаў, з'явіліся таксама аналітычныя выданні, даведнікі. Пашырэнне доступу да дакументаў спрыяе развіццю гістарычнай навукі. Адкрываюцца новыя старонкі гісторыі, ад агульнага даследчыкі пераходзяць да больш канкрэтных пытанняў. Сучасныя тэхналогіі дазваляюць варыятыўна падыходзіць да публікацый (адбіраць дакументы з улікам храналогіі, рэгіёна ці па брыгадах), шукаць раней невядомыя тэмы ці гляджзець на іх пад іншым вуглом.

Кіраўнік навукова-даследчыцкай групы ваеннай гісторыі Беларусі «Рубон» Дзмітрый КІЕНКА звярнуў увагу на тое, што дзякуючы электронным выданням можна больш даведвацца пра ваенныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі нашай краіны. Даследчык цікавіцца гісторыяй савецкай авіяцыі, адсочвае лёсы не толькі лётчыкаў Чырвонай Арміі, але і ворагаў, бо кожны збіты нямецкі самалёт — гэта чыясьці перамога з савецкага боку. Так, у зборніку з партызанскімі дакументамі за 1944 год яму ўдалося знайсці больш за дзясятак паведамленняў аб падзенні нямецкіх самалётаў з канкрэтнай прывязкай да пэўнай мясцовасці, яшчэ ў больш чым 20 справаздачах партызаны паведамлялі аб тым, што брыгадамі была збіта варожая авіяцыя.

Бясспрэчна, новае электроннае дакументальнае выданне будзе цікавае не толькі гісторыкам, але і музейшчыкам, настаўнікам, краязнаўцам, усім нераўнадушным да гісторыі партызанскага руху і наогул да Другой сусветнай вайны.

Навігацыя

Электроннае выданне максімальна набліжана па сваім складзе да класічных дакументальных зборнікаў. У яго ўвайшлі лічбавыя копіі аператыўных зводак Паўночна-Заходняй групы пры ЦК КП(б)Б і СНК БССР, інфармацыйных зводак ЦК КП(б)Б, аператыўных і разведвальных зводак Беларускага штаба партызанскага руху, а таксама спецпаведамленняў і разведданых аператыўна-чэкісцкай групы наркамата ўнутраных спраў БССР за чэрвень—снежань 1942 года. Дакументы размешчаны па храналагічным прынцыпе і адлюстроўваюць асноўныя кірункі (баявую, дыверсійную і разведвальную) партызанскай барацьбы на акупаваных тэрыторыі Беларусі. Таксама электроннае выданне ўтрымлівае біяграфічныя звесткі пра найбольш вядомых партызанскіх камандзіраў, чые прозвішчы сустракаюцца ў зводках, даецца геаграфічны паказальнік з прывязкай да канкрэтных дакументаў, дзе згадваецца пэўны населены пункт.

Ёсць у выдання і ілюстрацыйны аддзел — размешчаны архіўныя фатаграфіі і малюнкі. Разгорнутая гістарычная прадмова пазнаёміць з падзеямі, якія папярэднічалі стварэнню Беларускага штаба партызанскага руху.

Склад дакументаў дастаткова разнастайны. «Гэтымі дакументамі мы хацелі паказаць тры кіруючыя цэнтры: непасрэдна Штаб беларускага партызанскага руху (да яго стварэння — Паўночна-Заходняя група), зводкі ЦК і развіццё партызанскага руху па партыйнай лініі, а трэці цэнтр — па лініі органаў дзяржбяспекі, — заўважыў на прэзентацыі выдання Святаслаў Кулінок. — Асаблівасцю зводак Паўночна-Заходняй групы з'яўляецца тое, што яны носяць яскрава выражаны рэгіянальны характар, датычацца ў першую чаргу тэрыторыі Віцебшчыны і паўночнай Міншчыны. Шмат матэрыялаў, звязаных з тэрыторыяй Беларусі, якая мяжуе з РСФСР».

Цэнтралізацыя

«Лета 1942 года. Чырвоная Армія панесла цяжкае паражэнне пад Харкавам, быў фактычна адкрыты шлях да Волгі і на Паўночны Каўказ, — **супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі Анатоль КРЫВАРОТ** расказвае, чым быў складаны 1942 год і чаму кіраўніцтва СССР надавала сапраўды вялікае значэнне партызанскаму руху. — У маі 1942 года ўпершыню ў загадзе Вярхоўнага галоўнакамандуючага прагучала думка, што партызанскі рух — важны фактар у гэтай вайне. Гэта перыяд узбуйнення партызанскіх фарміраванняў. Інфармацыю з месцаў Паўночна-Заходняя група, якая знаходзілася недалёка ад мяжы, а потым і Беларускі штаб партызанскага руху атрымлівалі па цікавым канале — у той перыяд радыёсувязь была вельмі слабая, звесткі прыносілі сувязныя. Важнасць зборніка ў тым, што ён дае магчымасць даследчыкам паглядзець, як крок за крокам партызанскі рух на тэрыторыі Беларусі станавіўся магутнай сілай. Яшчэ гэта перыяд, калі пачалі масава закідвацца спецгрупы».

З актыўным супраціўленнем (партызанскім рухам і падпольнай барацьбой) захопнікі ў Беларусі сутыкнуліся з першых дзён вайны. Але вялікіх маштабаў барацьба дасягнула са стварэннем Беларускага штаба партызанскага руху. Ужо на сёмы дзень вайны 29 чэрвеня 1942 года была выдадзена сакрэтная дырэктыва Савета народных камісараў і ЦК ВКП(б), у якой гаварылася, што ў занятых ворагам раёнах трэба стварацъ партызанскія атрады і дыверсійныя групы.

Першыя партызанскія атрады былі разрозненыя, не атрымлівалі канкрэтных указанняў.

У сакавіку 1942 года была створана Паўночна-Заходняя група ЦК КП(б), якая вяла работу ў палосе Калінінскага фронту, знаходзячыся паблізу граніц БССР. Сюды прыбывалі партызанскія сувязныя з каштоўнымі звесткамі, сцякалася вялікая колькасць баявой і разведвальнай інфармацыі, паступалі даныя аб дзейнасці падпольных органаў, арганізацый, партызанскіх атрадаў і груп.

Толькі за жнівень ад партызанаў паступіла інфармацыя больш чым аб 30 гарнізонах, размешчаных у Бягомльскім, Лепельскім, Ушацкім, Халопеніцкім раёнах.

Важную ролю ў станаўленні і развіцці партызанскага руху і яго ваенна-аператыўнага кіраўніцтва ў рэспубліцы адыграў Інстытут упаўнаважаных ЦК КП(б)Б. Як правіла, партыйныя работнікі накіроўваліся на акупаваную тэрыторыю ў якасці ўпаўнаважаных ЦК па абласцях і раёнах.

Да стварэння БШПР адзінага плана баявых дзеянняў патызанаў у маштабах рэспублікі не было. А менавіта з яго узнікненнем звязана рэзкае павелічэнне колькасці атрадаў і эфектыўнасці дзейнасці партызанаў.

Штаб распрацоўваў і ажыццяўляў планы па развіцці партызанскай барацьбы, арганізоўваў цэнтралізаванае кіраўніцтва партызанскімі фарміраваннямі і іх узаемадзеянне з часцямі Чырвонай Арміі і органамі НКУС, планаваў, арганізоўваў і кантраляваў выкананне баявых заданняў. Вырашаў праблемы з забеспячэннем партызанаў зброяй, сродкамі сувязі, медыкаментамі і іншым, рыхтаваў кадры для партызанскай барацьбы ў тыле ворага. Інфармацыя аналізавалася, распаўсюджваўся баявы вопыт партызанскай барацьбы.

Атрыманыя ад партызанаў разведданыя перадаваліся камандаванню франтоў, а найбольш важныя — у Генеральны штаб Чырвонай Арміі.

Восенню 1942 года ЦШПР распрацаваў і зацвердзіў прыкладную схему зводкі, якую разаслаў ва ўсе рэспубліканскія і абласныя штабы партызанскага руху. Гэтым дакументам зводкі дзяліліся на аператыўныя і разведвальныя. Даныя, якія адносяцца да аператыўнай дзейнасці партызанскіх атрадаў (праведзеныя аперацыі, дыверсіі, крушэнні цягнікоў, падрывы мастоў), сталі падавацца асобна.

Першая разведвальная зводка БШПР была падрыхтавана 16 кастрычніка 1942 года.

Нішто не заставалася без увагі партызанаў. Яны дасылалі даныя аб гарнізонах і перамяшчэнні войскаў праціўніка, пра тое, якой прамысловасцю захопнікі займаюцца на акупаваных тэрыторыях, як ахоўваюць камунікацыі, дзе працуюць школы дыверсантаў. Данясенні аб баявой дзейнасці і разведвальнай рабоце мелі вялікае ваенна-аператыўнае значэнне: ад гэтага залежала эфектыўнасць дзеянняў партызанаў у тыле і воінаў Чырвонай Арміі на фронце.

Па плане

Восенню 1942 года БШПР быў падрыхтаваны «План развіцця партызанскага руху і дзеянняў партызанскіх атрадаў». Перад партызанамі ставіліся канкрэтныя задачы: далейшае развіццё руху, асабліва ў заходніх абласцях, пранікненне ў гарады і ўзмацненне дыверсій у прамысловасці, насаджэнне дыверсійна-разведвальнай агентуры ў гарадах, знішчэнне нямецкіх афіцэраў і чыноўнікаў, узмацненне дыверсій на чыгунках, знішчэнне эшалонаў, чыгуначных мастоў, пашырэнне сеткі радыёсувязі з асноўнымі раёнамі Беларусі, узмацненне палітычнай барацьбы сярод насельніцтва і ў атрадах, стварэнне і распаўсюджванне друкаванай прапагандысцкай прадукцыі.

Партызанскія злучэнні сталі атрымліваць індывідуальныя «даручэнні», наладзілі бесперапыннае назіранне за шасэйнымі і чыгуначнымі дарогамі. За кожнай брыгадай і асобным атрадам замацоўваліся раёны дыслакацыі і баявых дзеянняў, а таксама ўчасткі чыгуначных і шасэйных камунікацый для правядзення аперацый па зрыве перавозак ворага.

Зводкі сведчаць пра тое, з чым сутыкнуўся вораг на тэрыторыі нашай рэспублікі. Так, у электронным зборніку размешчаны дакумент за 14 кастрычніка 1942 года — звесткі аб рабоце ў тыле праціўніка дыверсійна-разведвальнай групы Новікава (яна была накіравана ў тыл праціўніка ў жніўні 1942-га). Байцы даюць справаздачу пра тое, што ім удалося замініраваць чыгунку, узарваць цягнік і вагоны з боепрыпасамі, рух цягнікоў на лініі Віцебск—Полацк быў спынены на некалькі сутак. Адзначаецца, што ворагу даводзіцца быць больш асцярожным: «Калі ў жніўні ў сярэднім праз кожныя дзве гадзіны праходзіла тры эшалоны, то за перыяд з 1 да 10 верасня за гэты ж час адзначана праходжанне ўсяго аднаго эшалона. У начны час чыгунка наогул не функцыянуе. Рух воінскіх эшалонаў у сувязі з больш частымі крушэннямі-дыверсіямі немцы пачалі праводзіць камбінавана, спачатку прапускаюць адзін-два эшалоны з малакаштоўным грузам (торф, вугаль), а затым — воінскія эшалоны з жывой сілай і ваеннымі матэрыяламі».

На асобных участках чыгункі Віцебск—Полацк немцы змянілі таксама сістэму аховы і патруляванне чыгуначнай дарогі. Мясцовае насельніцтва да аховы чыгункі не дапускаецца... Патруляванне паўсюдна праводзіцца групамі немцаў па 6—9 чалавек.

Падыходы да чыгуначных шляхоў замініраваны, найбольш важныя масты ахоўваюцца спецыяльнымі групамі немцаў, узброеных кулямётамі, мінамётамі, а часам і пушкай... А ў вёсках і пасёлках, размешчаных паблізу чыгункі, расклеены аб'явы, якія папярэджваюць насельніцтва, што пры крушэнні цягніка паблізу населенага пункта насельніцтва будзе расстраляна, а населены пункт спалены.

Маштабы ўражваюць

Вынікам актыўнай баявой дзейнасці стала стварэнне партызанскіх зон. Ушацка—Лепельская існавала ўжо восенню 1942 года і ішла ад Полацка на поўнач да Лепеля на поўдні. Гэта тэрыторыя плошчай звыш за 3200 км², на якой пражывала больш за 80 тысяч жыхароў. Да канца 1942 года на тэрыторыі Беларусі існавала ўжо шэсць партызанскіх зон і краёў.

Партызаны сачылі за размяшчэннем і перасоўваннем нямецкіх войскаў, будаўніцтвам абарончых збудаванняў, размяшчэннем аэрадромаў, паведамлялі пра зверствы акупантаў, чыгуначныя і аўтамабільныя перавозкі, падрыхтоўку і правядзенне карных аперацый, інфраструктуру і размяшчэнне важных аб'ектаў у гарадах Беларусі, адміністрацыйна-тэрытарыяльны лад, падаткаабкладанне і іншыя дзеянні акупантаў.

У кастрычніку 1942 года партызанамі быў выяўлены буйны карны атрад, які з канца верасня дзейнічаў ў Сенненскім, Віцебскім і Бешанковіцкім раёнах сілай да 1500 чалавек, што ачышчаў лес ад партызанаў і рабаваў насельніцтва.

Разведзводка за 1 снежня 1942 года паведамляе пра карны атрад у Магілёўскай вобласці, пра размяшчэнне нямецкіх гарнізонаў, работу чыгуначных дарог і аўтамагістраляў. Адзначаецца, колькі праходзіла эшалонаў на Магілёў—Оршу і што вагоны загружаны танкамі, аўтамашынамі, мінамётамі, жывой сілай праціўніка.

Ніколі яшчэ ў гісторыі партызаны ў такім маштабе не выкарыстоўваліся для вядзення разведвальнай дзейнасці, як у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Электронны зборнік утрымлівае архіўныя фатаграфіі.

Спадкаемцы

ТОНКАСЦІ НАПІСАННЯ,

або Як аднаўляюць старажытныя шрыфты

У Нацыянальнай бібліятэцы адкрылася выстаўка «Шрыфт: litera in primo», прымеркаваная да 75-гадовага юбілею Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

— Вельмі часта ў бібліятэцы мы гаворым пра змест кнігі і мастацкае аздабленне — найперш звяртаем увагу на вокладку, на ілюстрацыі і нярэдка забываемся на самае важнае, на тое, што здаўна фарміравала вобраз кнігі, — на шрыфт, — заўважыў падчас адкрыцця выстаўкі

намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Аляксандр СУША. — На тэрыторыі нашай зямлі шрыфты заўжды былі вельмі важнай часткай кнігапісальнай традыцыі.

Нават самыя першыя ўстаўныя рукапісы XI—XIII стагоддзяў мелі свае асаблівасці. У далейшым сфарміраваўся беларускі скарапіс, які адрозніваўся ад таго, што мелі суседзі з Захаду ці з Усходу. На аснове даўняй рукапіснай традыцыі ствараліся ўжо шрыфты для кнігі друкаванай. Згадваючы пра спадчыну Францыска Скарыны, ці задумваемся мы пра тое, што ім была здзейснена сапраўдная шрыфтавая рэвалюцыя? Шрыфт Скарыны лёгкачытэльны ў параўнанні з уставам ці скорапісам, якія існавалі перад тым. Ён вельмі добра зразумелы і лёгкі для ўспрымання — амаль без надрадковых і падрадковых значкоў, без пропускаў.

Будны і Цяпінскі паспрабавалі гэтую традыцыю развіваць, але, на жаль, у XVI стагоддзі яна перарвалася. Беларускія выданні больш позняга часу чытаюцца значна цяжэй і адыходзяць ад беларускай нацыянальнай традыцыі.

Для Беларусі было вызначальным і XX стагоддзе. Адбывалася фарміраванне сучаснай беларускай мовы, яе нармалізацыя, ствараліся падручнікі, натуральна, вялася работа і над іх графічным аздабленнем. Да таго ж пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пачалася барацьба з непісьменнасцю, выходзіла багата часопісаў і кніг. Натуральна, на нашай тэрыторыі адбываецца ўздым шрыфтавога мастацтва. Многія жывапісцы таго часу, як мясцовыя, так і прыезджыя, вядомыя нам сваімі карцінамі, штукараць у тым ліку і над напісаннем літар. Асаблівай увагі заслугоўвае яўрэйская шрыфтавая культура — у 20-я гады творцы шмат эксперыментавалі, стварылі для газет, часопісаў і кніг авангардныя, вельмі яскравыя шрыфты.

Калі мы згадаем літаратурныя аб'яднанні, напрыклад, маладнякоўцаў, зазірнём у беларускія газеты, зможам пераканацца, як многа было зроблена і які быў пошук нацыянальнага стылю, у тым ліку і ў шрыфце.

Сучасная Беларусь мае ўнікальную школу шрыфту, майстры графічнага мастацтва абапіраюцца на даўнія традыцыі, і, безумоўна ж, на выданні Францыска Скарыны.

Дзякуючы рабоце студэнтаў і выкладчыкаў сёння скарынінаўскі шрыфт мы маем у камп'ютарным выглядзе.

Мастак, які двойчы адзначаны дыпломамі імя Францыска Скарыны, **дацэнт, член Беларускага саюза мастакоў, дэкан факультэта дызайну дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Усевалад СВЕНТАХОЎСКІ** расказаў, што распрацоўка шрыфтоў вялася сіламі студэнтаў дзвюх кафедраў прыкладна тры гады. Вынікі маштабнага праекта па аблічбаванні і рэканструкцыі шрыфтоў выданняў, якія выходзілі сто гадоў таму і якія захоўваюцца ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі, прадстаўлены ў экспазіцыі.

Шрыфт Скарыны лёгкачытэльны ў параўнанні з уставам ці скорапісам, якія існавалі перад тым. Ён вельмі добра зразумелы і лёгкі для ўспрымання

Шрыфт таксама можа ўплываць на слова — калі яго пісаць па-рознаму, змяняюцца сэнс і пасыл. Так, ён можа стаць паведамленнем, пасланнем і нават мастацкім творам.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Уражанні

Вас чакае «Планета без віз»

Для сучаснага чалавека вандроўкі — надзвычай простае і даступнае хобі, без якога ўжо складана ўявіць жыццё. Аднак 2020 год і пандэмія пазбавілі людзей гэтага задавальнення і новых уражанняў... Калі засумавалі па магчымасці адкрываць новыя мясціны, то ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага вас чакае выстаўка Станіслава ЯНЧАРСКАГА «Планета без віз». Фотавандроўка дазволіць усім ахвотным наведаць 25 краін свету: Беларусь, Аргенціну, Грэцыю, Бразілію, Італію, Ісландыю і шмат іншых...

Наведаўшы экспазіцыю, вы зможаце ўбачыць каля 170 фотаздымкаў, якія аўтар зрабіў падчас сваіх падарожжаў у перыяд з 2014-га да 2020 года. Прычым многія з яго паездак — гэта арганізаваныя фотатуры. Кожны кадр нараджаецца ў складаных умовах: горы, пустыні, вулканы, вадаспады — небяспечная і велічная прырода не кожнага падпускае блізка да сябе. Акрамя пейзажнай, будзе прадстаўлена таксама і жанравая фатаграфія. Сам фотамайстар адзначае, што дзеля ўдалага здымка гатовы пераадольваць любыя маршруты і складанасці:

— Вандраваць у фармаце «пражываць у гатэлі і ляжаць на пляжы» дакладна не мой варыянт. Хоць, калі здараюцца паездкі тыдні на два, то некалькі дзён я магу выдзеліць для такога адпачынку, а потым мне зноў трэба рухацца, вывучаць розныя завулкі, фатаграфаваць, — кажа Станіслаў Янчарскі. — Але проста вандроўка і фотатуры — гэта розныя паездкі. Бо, напрыклад, зімой я вярнуўся з фотатура ў Алжыр, здымалі ў пустыні Сахара. Ты прыязджаеш у месца, дзе адсутнічае сувязь, няма вады (робіш запасы на дзесяць дзён) і на сон можаш выкраіць гадзін шэсць максімум. А ўвесь астатні час фатаграфуеш.

Як адзначае фатограф, не абыходзіцца ў паездках і без экстрыму і форс-мажораў, але да ўсяго ён прызвычаіваецца і арыентуецца ў абставінах па сітуацыі. Бо, скажам, не ўсюды яшчэ нават сёння спакойна і добразычліва ўспрымаюць чалавека з фотаапаратам. У некаторых арабскіх краінах неабходна быць асцярожным, паколькі рэакцыя можа стацца самай нечаканай. А вось згадваючы сваю паездку ў Іран, фотамайстар расказвае, што людзі там былі адкрытыя, размаўлялі і фатаграфаваліся з задавальненнем:

— Вядома, за гады работы я ўжо маю пэўны досвед, які дазваляе не трапляць у надзвычайныя сітуацыі, хоць і не заўсёды ўсё можаш прадбачыць. Калі накіроўваешся ў Антарктыду і на невялікім караблі трапляеш у шторм, то гэта ўжо экстрэмальная сітуацыя. Тое ж адчуваеш і спускаючыся ў дзеюча вулкан, каб зрабіць фотаздымак. Але мне цікава працаваць менавіта ў такіх месцах, а вось тыя маршруты, дзе ўсё абходжана турыстамі, свядома мінаю.

Станіслаў Янчарскі аб'ездзіў шмат краін, а нарадзіўся будучы фотамайстар у вёсцы на Гродзеншчыне. З 1979 года пераехаў жыць у сталіцу. З'яўляецца аўтарам кніг «Замалёўкі вандроўніка», «Пяшчотны холад», таксама выйшаў з яго ўдзелам 1-ы том тэматычнага выдання «Касцёлы Беларусі». Актыўна прымае ўдзел у розных выставачных фотапраектах. На міжнародным конкурсе «35 AWARDS», дзе ўдзельнічалі фатографы з 172 краін свету і было прадстаўлена 392 тысячы работ, Станіслаў увайшоў у лік 100 найлепшых фатографаў у чорна-белай намінацыі, і яго работа была апублікавана ў выніковым каталогу. Але толькі сам аўтар ведае, што, каб зрабіць той самы фотаздымак, яму давялося спачатку ляцець да Парыжа, адтуль у Буэнас-Айрэс, потым ехаць на машыне ў Анды і тры разы паднімацца ў горы.

— Асабліва важна і актуальна для мяне падзяліцца сваімі фотаздымкамі зараз, калі ўжо столькі часу людзі амаль нікуды не выязджаюць. Ды і палітра прадстаўленых краін на выстаўцы такая, што не кожны можа туды трапіць. Аднак галоўнае, каб людзі зразумелі, што ў жыцці ўсё магчыма.

Фотавыстаўка адкрыецца 4 лістапада і будзе чакаць сустрэчы з наведвальнікамі да 6 снежня 2020 года ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага ў Мінску па адрасе: пл. Свабоды, 15. Дарэчы, па суботах у падарунак ад аўтара ўваход для жанчын бясплатны.

Алена ДРАПКО.

ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ЛІСТАПАД

3 лістапада, аўторак. Удалыя атрымаюцца лёгкія, паветраныя прычоскі. Пасля стрыжкі ў такія дні валасы павольна растуць, але іх структура і стан не змяняюцца.

4 лістапада, серада. Стрыгчы валасы непажадана, узнікне агіда да жыцця.

5 лістапада, чацвер. Стрыжка, якую вы задумалі, атрымаецца няўдалая.

6 лістапада, пятніца. У гэты дзень лепш не наведваць салон прыгажосці. Вынікі любых спроб паўплываць на даўжыню, форму або колер валасоў хутчэй засмуцяць, чым уразяць.

7 лістапада, субота. Найбольш спрыяльныя дні для стрыжкі і інтэнсіўнага догляду за валасамі з мэтай паляпшэння іх структуры. Стрыжка дапаможа рэалізаваць планы, а жыццё стане больш цікавае!

8 лістапада, нядзеля. Сёння найлепшыя суткі месяца для маніпуляцый з прычоскай. Атрымаецца надаць валасам ідэальны знешні выгляд.

9 лістапада, панядзелак. Спрыяльны дзень для стрыжкі, валасы растуць лепш, а выпадаюць і сякуцца менш.

10 лістапада, аўторак. Выдатны дзень для стварэння новай стрыжкі. Пры Месяцы ў знаку Дзевы новая прычоска даўжэй захавае сваю прыгажосць і форму.

11 лістапада, серада. Гэты дзень добры для фарміравання паветраных, пышных прычосак.

12 лістапада, чацвер. Стрыжка ў гэты дзень спрыяльна адаб'ецца на прыгажосці валасоў, а таксама прынясе іх уладальніку шчасце.

13 лістапада, пятніца. У гэты дзень стрыгчы валасы непажадана, бо падобная змена іміджу можа значна сапсаваць настрой.

14 лістапада, субота. Не хадзіце да цырульніка, можаце выдаткаваць дарма грошы, страціць настрой і пагоршыць якасць валасоў. Акрамя таго, стрыжка можа прынесці праблемы са здароўем.

15 лістапада, нядзеля. Многія не рэкамендуюць стрыгчы валасы ў маладзік, але адным астролагам адзначана, што гэта можна зрабіць, калі вас мучаць галаўныя болі — пасля стрыжкі яны знікнуць.

16 лістапада, панядзелак. Выдатны час для стрыжкі. У гэты дзень пачынаецца новая фаза месяца, а значыць, стрыжка прымусіць валасы расці хутчэй.

17 лістапада, аўторак. Астролагі кажуць, што гэты дзень падыходзіць для стрыжкі тым, у каго ў апошні час усё «валіцца з рук». Калі змяніць прычоску, то ўсё павернецца ў патрэбнае рэчышча. Акрамя таго, дзень падыходзіць тым, хто гадуе валасы: дастаткова ўсяго толькі на сантыметр падстрыгчы валасы і ўжо пад канец месяца можна будзе заўважыць, як яны хутка сталі даўжэйшыя. А вось афарбоўкай валасоў у гэты дзень лепш не займацца.

18 лістапада, серада. Падразанне кончыкаў валасоў або стрыжка паспрыяе не толькі паляпшэнню саміх валасоў, але дабратворна адаб'ецца на сасудах галаўнога мозга.

19 лістапада, чацвер. Добры дзень для стрыжкі — яна падорыць натхненне, паспрыяе ўзнікненню цікавых ідэй і, магчыма, дапаможа здзейсніць прарыў, нешта вынайсці.

20 лістапада, пятніца. Нейтральны дзень для стрыжкі і афарбоўвання валасоў. Для афарбоўкі выбірайце натуральныя адценні.

21 лістапада, субота. Для павышэння здольнасці да творчасці і поспеху ў прафесійнай дзейнасці рэкамендуецца падстрыгчыся або зрабіць аб'ёмную ўкладку.

22 лістапада, нядзеля. Як стрыжка, так і мыццё галавы ў гэты дзень можа справакаваць з'яўленне перхаці.

23 лістапада, панядзелак. Двайны негатыў на валасы — Месяц у Рыбах плюс дзявяты месячны дзень. Нават самы кампетэнтны майстар у гэты дзень не зможа зрабіць вам жаданую прычоску. Вы рызыкуеце заплаціць шмат грошай за паслугі цырульніка і ў выніку застацца ля разбітага карыта.

24 лістапада, аўторак. Не стрыжыце валасы, лепш нават не мыць галаву. Валасы вельмі ўспрымальныя да траўмы. Акрамя таго, сёння лепш не мяняць імідж, каб не прыцягнуць непрыемнасці.

25 лістапада, серада. Дзень добра падыходзіць для працэдур, якія ўмацоўваюць валасы: масак, абкручванняў, масажу. Гэтыя меры істотна палепшаць іх знешні выгляд і дабратворна паўплываюць на самаадчуванне ў цэлым.

26 лістапада, чацвер. Стрыгчы валасы нельга — прыцягваюцца няшчасці, траўмы і павышаецца верагоднасць пагрозы для жыцця.

27 лістапада, пятніца. Добры дзень для стварэння шэдэўраў укладкі і звычайных стрыжак. Наведванне цырульніка прынясе шчасце і дабрабыт, хоць і сродкаў можа быць выдаткавана больш, чым звычайна.

28 лістапада, субота. Дзень вельмі спрыяльны для стрыжкі. Пасля гэтага валасы аднаўляюцца, растуць хутчэй.

29 лістапада, нядзеля. Жадаеце зрабіць структураваную або аб'ёмную стрыжку — запішыцеся да майстра на гэты дзень.

30 лістапада, панядзелак. Стрыжка ў перыяд зацьмення вельмі не рэкамендуецца, яна можа прынесці няшчасці.

РОЎНАСЦЬ ЧАЛАВЕКА І ПЧАЛЫ

Яе сцвярджае бортніцкае права, хоць яго і няма на паперы

Кніга-альбом «Бортніцтва — сувязь часоў» нядаўна ўбачыла свет у выдавецтве «Чатыры чвэрці». Выданне з'яўляецца працягам серыі «Культурная спадчына Беларусі», якая выдаецца з 2015 года пры падтрымцы ААТ «Банк развіцця Рэспублікі Беларусь». Раней свет убачылі пяць кніг-альбомаў пра розныя традыцыі, звычаі, абрады, што захаваліся на нашай зямлі. Пагартаўшы новае выданне разам з яго стваральнікамі, мы даведаліся шмат цікавага аб старажытнай пчалярскай справе.

ПРАВАДНІКІ Ў СВЕЦЕ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

— Кожны праект нараджаецца па-рознаму. З гэтым выданнем як атрымалася... Калі рыхтавалі кнігу «Жывая культура Беларусі», шмат працавалі з вядомым беларускім фотамастаком, членам праўлення народнага фотаклуба «Мінск» Альфрэдам Мікусам. Менавіта ён, калі мы згадвалі ў кнізе пра бортніцтва, расказаў нам, што гэты промысел найбольш захаваўся на Гомельшчыне. У гэты рэгіён два гады ездзілі вядомыя даследчыкі, фіксавалі працэсы і занатоўвалі размовы з бортнікамі, — расказвае **дырэктар і галоўны рэдактар выдавецтва «Чатыры чвэрці» Ліліяна АНЦУХ, яна ж з'яўляецца адным з аўтараў і ўкладальнікам выдання.** — Узяліся вывучаць тэму, і высветлілася, што ў 2020 годзе запланавана ўключэнне бортніцтва ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА (матэрыялы на ўключэнне беларускія бортнікі падалі ў Нацыянальную камісію Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА, гэтаксама ў сябе зрабілі і польскія бортнікі). І вось тады пачалася работа над кнігай.

Бортніцтва — пачатковая форма культурнага пчалярства, заснаванага на развядзенні і ўтрыманні лясных пчол-баровак у штучных дуплах (борцях). У Беларусі яно захавалася як традыцыйны промысел з глыбокім культурным кантэкстам. Ён ахоплівае як канкрэтныя практыкі па вырабе калод, вулляў, борцяў, прылад і прыстасаванняў, так і шырокі пласт ведаў пра навакольны свет, а таксама ўменні і веды, звязаныя з дрэва-, скура-апрацоўкай, элементы нематэрыяльнай культуры — і ўсё разам можна разглядаць як культурны код супольнасці, сям'і і рэгіёнаў. Кніга-альбом «Бортніцтва — сувязь часоў» выйшла на беларускай, рускай, польскай і англійскай мовах. Да супрацоўніцтва запрасілі даследчыкаў Рэгіну Гамзовіч і Івана Восіпава. Улічваючы, што інфармацыю рыхтавалі на чатырох мовах, далучылі да працэсу найлепшых перакладчыкаў.

Выданне дае нагляднае ўяўленне, як жыве і захоўваецца бортніцтва на Убарцкім Палессі. Можна даведацца і пра ўвесь працэс лясного пчалярства, і пра прылады, якія для яго патрэбны, а таксама азнаёміцца з абрадамі, традыцыямі, і, што самае галоўнае, убачыць і пачуць саміх бортнікаў. Як адзначае Ліліяна Анцух, найбольш яе здзіўляюць людзі, якія пранеслі гэты занятак праз усё жыццё і цяпер прыкладаюць намаганні, каб перадаць свой вопыт новаму пакаленню.

«ЯК ПЧАЛА ВЫЖЫВЕ, ТО І ЧАЛАВЕК — БУДЗЕ...»

— У адрозненне ад рамачнікаў, лельчыцкія бортнікі не прывабліваюць раі. За выключэннем, калі нейкія катастрофы адбываюцца з іхнімі раямі. Задача бортнікаў — зрабіць са старога дрэва, струхлелага ўнутры, калодны вулей, павесіць яго, а тады (гэта называецца тварэнне) яго апрацоўваюць зёлкамі, без усялякай хіміі, мядовай вадкасцю (яна застаецца, калі вараць воск), і пчолкі лятуць на пах мёду і траў. Работа ў лесе на дрэве адбываецца два разы на год — вясной і восенню. Мёд бортнік мае права ўзяць толькі ўвосень і толькі тады, калі пчолы ўжо нанасілі яго для сябе на зімоўку. А калі не назапасілі, як сёлета, бо вельмі неспрыяльныя былі ўмовы, то бывае, што бортнік мае і 30 вулляў, але не будзе мець мёду, інакш пчолы не выжывуць. Асноўны клопат лельчыцкіх бортнікаў — гэта дапамагчы пчале існаваць у натуральных умовах, лясных і лугавых, — тлумачыць спецыфіку бортніцкай справы **грамадскі эксперт у галіне нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі Рэгіна ГАМЗОВІЧ.** — Тут людзі лічаць, што пчала ад Бога. І калі яна знікне, то знікне і чалавек. Нам расказвалі, што калі адбылася чарнобыльская катастрофа, назіралі за пчоламі і так вырашылі для сябе: калі тыя выжывуць, то і чалавек будзе жыць. Чаму ствараюць пчолам умовы, для чаго іх прывабліваюць? Не толькі каб нанасілі мёду (гэта стымул, але ён не заўсёды апраўдваецца), а для таго, каб на палях, агародах і ў садах, дзе пчолкі апыляюць расліны, усё радзіла. Таму што людзі з гэтага жывуць. Лічыцца таксама, што пчолы не толькі бортнікам мёд носяць, а ўсім. І калі ёсць добры ўзятак, то людзі дзеляцца ім не толькі са сваёй сям'ёй, але і з сябрамі, суседзямі.

Асноўны прынцып бортніцтва ў Лельчыцкім рэгіёне ў тым, што дзяды і прадзеды лясных пчаляроў перадавалі маладому пакаленню, напрыклад, інструменты. Тут і сякера, і пешня (жалезнае долата з доўгай масіўнай драўлянай ручкай), і цясла (інструмент з паўкруглым лязом, які выкарыстоўваецца ў даўбёжным рамястве), і шмат іншага.

Сярод бортнага начыння — лесвіца, дымар — прыстасаванне для адпуджвання пчол дымам, жэнь (лезіва) — выкарыстоўваецца для ўмацавання пчаляра на дрэве... Узаемаадносіны ў асяроддзі бортнікаў здаўна рэгулююцца бортным правам, якое не існуе на паперы, а хутчэй нагадвае негалосны закон. Там абгаворваюцца правы на ўладанне пчоламі і калодамі, выкарыстанне іх як сродку абмену ці дарэння, а таксама надаецца роўнасць чалавеку і пчале. А каб пазначыць свае калоды, то існавала здаўна «бортнае знамя» (знак) — выглядае як спалучэнне геаметрычных фігур розных відаў. Раней кожная частка бортнага знака мела сваю назву, і ў гістарычнай літаратуры захаваліся прыклады такіх назваў: «заечыя вушы», «саха», «рубеж» ды іншыя.

Варта адзначыць, што бортніцтва — гэта не толькі атрыманне мёду ад дзікіх пчол. Гэты промысел напрамую звязаны таксама з вытворчасцю воску, мае сувязь з многімі мясцовымі традыцыямі і рытуаламі. Напрыклад, вам раскажуць, што свечку на вяселле трэба зрабіць з воску ад жывых пчол, а для нябожчыка — ад памерлых пчолак. Альбо ўсе мы ведаем, што 14 жніўня ў Беларусі адзначаецца Мядовы спас, калі людзі ў царкве асвячаюць мёд і мак, а гаспадыні гатуюць розныя стравы з выкарыстаннем гэтых прадуктаў. Дык вось, людзі старэйшага пакалення з вёскі Дзяржынск памятаюць, як іх маці ў першы панядзелак Спасаўкі (пост з 14 да 28 жніўня) пяклі печыва «душыкі» — па колькасці душ у сям'і, змазвалі яго мёдам і качалі ў попеле... У тым рэгіёне ўся традыцыйная культура звязана з мёдам, воскам, пчалой.

І сёння лельчыцкія бортнікі, сярод якіх **Васіль САСНОЎСКІ з Руднішча,** кажуць пра галоўнае: «Зараз моладзь кінулася пчоламі займацца. Дай бог, каб і далей так было. Гэта ж ад нашай зямлі, ад нашых продкаў, яно павінна захоўвацца». Бортнікі шмат усяго ведаюць, і апякуюцца пчалой, і вучацца ў яе працавітасці. Гэта сямейная справа, якая перадаецца ад старэйшых да малодшых у сям'і. Але, калі няма каму перадаць, то вучаць суседа, як бачаць, што з яго будзе толк.

СПРАВА, ЯКАЯ ПАВІННА ЗАХОЎВАЦЦА

— Бортніцтву вучацца не паўгода і не год, а ўсё жыццё. Напрыклад, кажуць «мой дзед распавядаў, калі вясна будзе цёплая, без марозу, то значыць, набяром мёду», альбо што «кожныя тры гады трэба вылоўліваць соты старыя, каторыя ў галаве калоды, каб пчала пачала зноў цягнуць новыя соты і далей жыла, і ёй там было ўтульна». І бортнік такія веды збірае і назапашвае, — кажа **кіраўнік установы развіцця традыцыйнага бортніцтва «Братэрства босых бортнікаў», член Студэнцкага этнаграфічнага таварыства, акрэдытаванага ў ЮНЕСКА, Іван ВОСІПАЎ.** — У бортніцтве пчала не проста галоўная, яна і сёння мае сакральны статус. Нават калі яна джаліць бортніка і памірае, то ён яе не выкідвае, а хавае. І калі пчолы памерлі ў калодзе, то бортнік выграбае гэтых пчол і хавае ў зямлі. Гэта і ёсць самае галоўнае адрозненне, што бортнік ставіць на першае месца пчалу, яе выжыванне. Напрыклад, калі год дрэнны на медазбор, то галоўнае, каб пчолам засталося. Бортнік увесь час назірае за навакольным светам і робіць высновы. Калі вясна доўгая і халодная, то гэта вельмі моцна адбіваецца не толькі на колькасці мёду, але і на колькасці раёў, якія будуць раіцца самі па сабе. Але ўсё адно ўлетку бортнікі, каб не турбаваць пчол, могуць падыходзіць максімум на адлегласць 10—15 метраў, каб упэўніцца, што з калодамі ўсё ў парадку. Часам бортнік шмат працуе, глядзіць пчол, падразае суш (сухія соты), але ў выніку застанецца без мёду.

Стагоддзе таму спрытныя бортнікі трымалі і па 500 калод. Безумоўна, яны не толькі самі займаліся, але і наймалі людзей для дапамогі. А ўжо бліжэй да нашага часу медазбор моцна змяніўся. З-за тых жа асушаных балот, з-за асаблівасці лясной гаспадаркі. Бо пчале не пасаджаны лес патрэбны, а той, які традыцыйна расце ў нашых кліматычных умовах. І засушлівы клімат апошніх гадоў адбіваецца.

— У сённяшніх умовах вельмі складана данесці да сучаснага грамадства саму каштоўнасць, самі прынцыпы бортніцтва. Бо спажывецтва вельмі моцна ўплывае на перспектывы і на сутнасць гэтай дзейнасці. Зараз людзям часта хочацца ўсяго і адразу. А промысел між тым цікавы сам па сабе як занятак, які патрабуе фізічнай актыўнасці, пастаяннага мыслення, — дадае Іван Дзмітрыевіч. — Калі мы кажам пра промысел, то сёння яшчэ захаваліся традыцыйныя механізмы перадачы, засталіся яшчэ носьбіты розных узростаў. Аднак перспектыва дваістая: першае — захаванне промысла самімі носьбітамі ў першапачатковым выглядзе, у якім ён ім перадаваўся, а другое — пераход чыста ў камерцыйнае рэчышча, што адразу забівае сутнасць бортніцтва.

Сёння кніга-альбом «Бортніцтва — сувязь часоў» перададзена выдавецтвам у розныя рэгіёны Беларусі і за мяжу з мэтай распаўсюджвання ведаў пра адзін з найбольш старажытных промыслаў.

Алена ДРАПКО.
Фота дадзена выдавецтвам «Чатыры чвэрці».

Каментарый у тэму

Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лельчыцкага раёна Наталля ГАЎРЫЛАВЕЦ:

— Бортніцтва ў нашым рэгіёне і ўсё, што да яго мае дачыненне, — тэма цікавая, і ў нас назіраецца да яе інтарэс. Але ж мы разумеем, што бортнікі — гэта не супрацоўнікі сферы культуры, а людзі абсалютна розных прафесій, якія займаюцца гэтым промыслам. Таму мы вырашылі неяк аб'яднаць нашых жыхароў і, напрыклад, у маі, калі адзначаецца Міжнародны дзень пчалы, на базе аграгарадка Сіманічы пачалі ладзіць свята мёду. Туды мы запрашаем усіх пчаляроў, ладзім дэгустацыі, выстаўкі і продаж мёду, а таксама выстаўкі адпаведнай літаратуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Бачым, што інтарэс з боку як удзельнікаў, так і наведвальнікаў высокі, таму маем намер праводзіць гэтае свята штогод. Плюс у нас у Мілашэвіцкім лясгасе таксама збіраюць розныя матэрыялы, звязаныя з гэтай тэмай, для стварэння музея. У раённым музеі можна ўбачыць экспанаты, якія распавядаюць пра бортніцтва. Прэзентавалі гэты промысел і на форуме «Музеі Беларусі». Але, зразумела, што мы толькі ў пачатку вялікага шляху па папулярызацыі згаданага занятку. Мы імкнёмся актыўна супрацоўнічаць са школамі, каб у дзяцей не толькі было ўяўленне пра культурную спадчыну нашага рэгіёна, але каб яны самі рабіліся ўдзельнікамі пэўных абрадаў, промыслаў. Думаю, гэтаксама будзе і з бортніцтвам, але патрэбен час.

ИЗВЕЩЕНИЕ (ОБЪЯВЛЕНИЕ)
о проведении 03 декабря 2020 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «ТОПЗАПЭЛЕКТРО»

Предмет торгов

Квартира с инвентарным номером 500/D-210383,
общей площадью 40,1 кв. м
(назначение – квартира; наименование – квартира № 50).
Местонахождение: г. Минск, ул. Кольцова, 4/1-50.

Начальная цена: 128 000 белорусских рублей.
Сумма задатка: 6 400 белорусских рублей.
Шаг аукциона: 6 400 белорусских рублей.

Продавец имущества: ЗАО «ТОПЗАПЭЛЕКТРО», 220030, г. Минск, ул. Карла Маркса, 25-12Н, тел. 8 017 338 16 15.

Организатор торгов: ликвидатор ЗАО «ТОПЗАПЭЛЕКТРО», 220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 39-8Н, тел. 8017 338 16 15.

Условие торгов: торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (договор о задатке), внесшие в установленном порядке задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов);

копию свидетельства о регистрации и подлинник для заверения (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей);

копию устава либо учредительного договора и их подлинники для заверения (для юридических лиц);

копию платежного документа о внесении задатка с отметкой банка;

документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица;

оригинал документа, удостоверяющего личность, и его копию для заверения,

а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY20OLMP30120000826580000933 в ОАО «Белгазпромбанк», г. Минск, БИК OLMPBY2X, получатель – ЗАО «Топзапэлектро», УНП 100896485.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (единственному участнику аукциона) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов, которая отражается в протоколе о продаже предмета торгов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (единственным участником аукциона) подписывается в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (единственным участником аукциона) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **03 декабря 2020 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 39-8Н. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 03.11.2020 по 30.11.2020 включительно** в рабочие дни с 10.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 15.00) по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 39-8Н. По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (017) 338 16 15.

Телефон для справок:
(017) 338 16 15 (ЗАО «ТОПЗАПЭЛЕКТРО»).

ИЗВЕЩЕНИЕ (ОБЪЯВЛЕНИЕ)
о проведении 03 декабря 2020 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «ТОПЗАПЭЛЕКТРО»

Предмет торгов

Квартира с инвентарным номером 500/D-190210,
общей площадью 30,7 кв. м.
(назначение – квартира; наименование – квартира № 17).
Местонахождение: г. Минск, ул. Яна Райниса, 19-17.

Начальная цена: 100 000 белорусских рублей.
Сумма задатка: 5 000 белорусских рублей.
Шаг аукциона: 5 000 белорусских рублей.

Продавец имущества: ЗАО «ТОПЗАПЭЛЕКТРО», 220030, г. Минск, ул. Карла Маркса, 25-12Н, тел. 8017 338 16 15.

Организатор торгов: ликвидатор ЗАО «ТОПЗАПЭЛЕКТРО», 220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 39-8Н, тел. 8017 338 16 15.

Условие торгов: торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (договор о задатке), внесшие в установленном порядке задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов);

копию свидетельства о регистрации и подлинник для заверения (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей);

копию устава либо учредительного договора и их подлинники для заверения (для юридических лиц);

копию платежного документа о внесении задатка с отметкой банка;

документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица;

оригинал документа, удостоверяющего личность, и его копию для заверения,

а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

